Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ВЕРАСЕНЬ 15 1932 г. № 207 (4459).

Год выдавання XVI

## Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Бальшавікі Барысаўшчыны — у авангард барацьбы за прамфінплян. А. ФОГАРАШЫ — Сацыялдэмакратыя шукае выхаду з крызісу (2 стар.)
ТЭЗЛІН — Прамысловасьць Віцебску павінна ліквідаваць прарыў (3 стар.).
Якасьць апрацоўкі і тэрміны рашаюць посьпех сяўбы і зяблёва (1 стар.).
На Случчыне няма бальшавіцкай барацьбы за збожжа (1 стар.).
Забясьпечыць своячасовую зачу грошай па пазыцы (2 стар.).
Больш творчай ініцыятывы (3 стар.).
Фарсаваць загатоўку і вызазку дроў у пралетарскія цэнтры (3 стар.).
ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).
Да юбілею 40-гадовай літаратурнай дзейнасьці М. ГОРКАГА (4 стар.).
ЗА МЯЖОЙ:
Роспуск германскага рэйхстагу (4 стар.).
10-я армія адмовілася ваяваць супроць кітайскіх саветаў (4 стар.).

## Бальшавікі Барысаўшчыны—у авангард барацьбы за прамфінплян

Рэканструкцыйны пэрыяд, які характарызуецца тіганцкімі посьпехамі разьвіцьця вытворчых сіл краіны сацыялістычнага будаўніцтва, знаходзіць сваё яркае адлюстраванне ў эканамічным і культурным разьвіцьці рэспублік Савецкага саюзу, абласьцей, раёнаў.

Зараз з асаблівай нагляднасьцю прадстаўляюцца паказальнымі вынікі бальшавіцкай барацьбы КП(б)Б за сацыялістычную рэканструкцыю ўсяе народнае гаспадаркі, за будаўніцтва сацыялізму.

Зруйнаваны ў часе белапольскай акупацыі горад **Барысаў**, маючы да савецкай улады прамысловасьць пераважна саматужнага тыпу, зараз зьяўляецца адным з важнейшых прамысловых раёнаў БССР. На месцы старой, са зношаным абсталяваньнем «Бярэзіны», зараз узвышаюцца новыя карпусы і трубы «Бярэзінскага камбінату», з нованабудаванай запалкавай фабрыкай, па праву названай «Пралетарская перамога». Гэта фабрыка па сваім маштабе вытворчасьці мае важнейшае значэньне ва ўсім Савецкім саюзе. Пабудован буйны дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн», пашыран і пераабсталяваны гарадзкі камбінат і рад іншых прадпрыемстваў. На прадпрыемствах Барысаўшчыны працуе звыш 12 тыс. чал. З кожным годам павышаецца выраб прадукцыі.

У першым паўгодзьдзі буйнейшыя прадпрыемствы далі даволі паказальныя рэзультаты барацьбы за прамфінплян. На **Бярэзінскім** камбінаце вытворчая праграма выканана на 103 проц., па гуце імя **Дзмбаля** прамфінплян па вырабе прадукцыі на мясцовы рынак выканан на 113 проц. На радзе іншых прадпрыемстваў паасобныя цэхі і брыгады сыстэматычна перавыконваюць вытворчае заданьне.

Аднак, узятыя тэмпы перадавымі прадпрыемствамі, узорныя прыклады сапраўдных ударных цэхаў і брыгад ня сталі здабыткам усіх зьвеньняў прамысловасьці ў Барысаве. Большасьць прадпрыемстваў раёну **[illegible]** перад дзяржавай.

Гэта становішча не паслужыла перакапаўчым сыгналам барысаўскай партарганізацыі для мабілізацыі ўсіх сваіх сіл, усёй рабочае клясы на ліквідацыю дапушчанага адставаньня. Трэба проста сказаць, што **рабочае партыйнае кіраўніцтва некалькі аслабіла ў летні пэрыяд сваю ўвагу да работы прамысловасьці.** Прыкметна **аслабленьне** ўвагі раду вытворчых парткалектываў да рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, якія забясьпечваюць перамогу на ўсіх участках працы.

Іменна ў гэтым заключаецца прычына агульнага паніжэньня тэмпаў работы прамысловасьці. Бярэзінскі камбінат, які на працягу першага паўгодзьдзя займаў месца ў перадавых радах змагароў за прамфінплян па ўсіх паказальніках, зараз здае тэмпы. На запалкавай фабрыцы «Пралетарская перамога» ліпеньскі плян выкананы на 92 проц. і жнівеньскі—на 82.2 проц. На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» заданьне па вырабе сядзеньняў за ліпень выканана на 97 проц., за жнівень—на 100.8 проц.

Выкананьне праграмы на лесазаводзе камбінату **«Камінтэрн»** за ліпень і жнівень не перавышае 84 проц. На фанэрным заводзе гэтага-ж камбінату ліпеньскі плян на вытворчасьці на мясцовы рынак выкананы з перавышэньнем на 7,3 проц., а заданьне па вырабе на экспарт выканана толькі на 70 проц. У першай палове жніўня выпрацоўка на экспарт ужо дасягае 101 проц., а выпрацоўка па мясцовы рынак зьніжаецца да 72 проц. Лесазавод **гарсамбінату** выканаў жнівеньскі плян толькі на 77 проц.

Дрэнна стаіць справа з выкананьнем многімі прадпрыемствамі якасных паказальнікаў. Асабліва вялікае перавышэньне дапушчанай нормы браку даў у першым паўгодзьдзі завод імя Дамбаля. Аднак, яшчэ і да гэтага часу на гэтым заводзе, як і на інш. прадпрыемствах не выкарыстоўваюцца ўсе магчымасьці, усе сродкі грамадзкай узьдзеянасьці ў барацьбе за зьнішчэньне браку, за максымальнае павышэньне якасьці прадукцыі.

На стане работы прамысловасьці вельмі балюча адбіваецца цякучасьць рабочай сілы, аслабленьне працоўнай дысцыпліны. Цэлы рад прадпрыемстваў («Пралетарская перамога», імя Дамбаля, лесазавод «Камінтэрн» і інш.) адчуваюць вялікі недахват рабочай сілы. На «Пралетарскай перамозе» не хапае 250 рабочых. Кіраўніцтва камбінату, відавочна пад уражаньнем посьпехаў працы ў першым паўгодзьдзі, спакойна назірае на лаўрах самацёку, не клапоціцца аб арганізаваным наборы рабочай сілы і стварэньні ўмоў для спыненьня цякучасьці. За жнівень месяц прынята на работу 115 чал., а звольнена 125. Колькасьць прагулаў за апошнія два месяцы роўна колькасьці прагулаў за ўсё першае паўгодзьдзе.

Недахват рабочай сілы, павялічаныя прагулы прыводзяць да прастояў машын і варштатаў. У сувязі з такім зьявішчам па радзе прадпрыемстваў даволі пашырана практыка звышчасовых работ.

У аснове прычын павялічанай цякучасьці рабочай сілы і аслабленьня працоўнай дысцыпліны ляжыць слабая пастаноўка партыйна-масавай работы на прадпрыемствах, невыстарчальная барацьба з лятунамі і прагульшчыкамі, як патрыўшчыкамі працоўнай дысцыпліны на вытворчасьці.

У адносінах далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых мясцовыя арганізацыі не выкарыстоўваюць усіх наяўных рэсурсаў і магчымасьцяй. Паасобныя кіруючыя работнікі замест належнай ініцыятывы і напружанасьці ў рабоце ў гэтым пытаньні задавальняюцца нагаворкай «чым багаты, тым і рады». Толькі апартуніст можа ўводзіць у прынцып гэты «лёзунг», каб апраўдаць сваю коснасьць, нячуллае адносіны да паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы.

Барацьбу за далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых барысаўская партыйная арганізацыя павінна паставіць у якасьці аднэй з важнейшых задач у сыстэме работы па забесьпячэньні выкананьня прамфінпляну.

Няма такіх прычын, якімі можна было-б хоць у найменшай меры апраўдаць паніжэньне тэмпаў работы прамысловасьці. Вытворчая праграма рэальная. Тэхнічныя магчымасьці раду прадпрыемстваў Барысаўшчыны даюць магчымасьць значнага пашырэньня вырабу прадукцыі. У забесьпячэньні прадпрыемстваў сырцом не прадстаўляецца ніякіх труднасьцяй. І калі пры гэтых умовах ня выконваецца прамфінплян, дык толькі таму, што на прадпрыемствах падарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай. У рабоце паасобных вытворчых парт'ячэек і кіруючых органаў прадпрыемстваў мае месца апартуністычная практыка. Яшчэ і да гэтага часу ў радзе выпадкаў. наглядаецца недаацэнка разгортваньня масавай работы ў нізавым вытворчым зьвяне, цэху, брыгадзе. Гэтым тлумачыцца паніжэньне эфэктыўнасьці работы раду гаспадарча-разрахунковых брыгад, спыненьне практыкі зьменнасустрэчнага плянаваньня і назіраньня такіх прадпрыемстваў (лесазавод «Камінтэрн»), кіраўніцтва якіх лічыць немэтазгодным пераводзіць брыгады на гаспадарчы разрахунак. Як выконваюцца абавязкі па сацыяборніцтве і ўдарніцтве камуністамі і беспартыйнымі рабочымі — многія парт'ячэйкі зусім ня цікавяцца.

**Такое становішча работы на прадпрыемствах павінна прыцягваць да сябе сур'ёзную ўвагу раённага партыкіраўніцтва.** Неабходна мабілізаваць партыйную арганізацыю на ўзмацненьне барацьбы з расхлябанасьцю на вытворчасьці, з усякімі пралётарнымі апартуністычнай практыкі.

На прадпрыемствах Барысаўшчыны абсалютную большасьць складаюць маладыя рабочыя, якія нядаўна прынялі на вытворчасьць. Гэта абавязвае партыйныя калектывы і ячэйкі дыфэрэнцыяваць сваю работу, палепшыць якасьць групавой індывідуальнай агітацыі на прадпрыемствах, дамагаючыся ўпартай, настойлівай работай перамаганьня старых традыцый і звычаеў у сьвядомасьці людзей. Трэба мабілізаваць шырокія масы рабочых на барацьбу супроць рвацкіх настроеў, супроць дэзарганізатараў вытворчасьці—лятуноў і прагульшчыкаў. Трэба па-сапраўднаму ўзяцца за практычнае ажыцьцяўленьне пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб партыйна-масавай рабоце, за поўную рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, падпарадкаваючы ўсю гэту работу задачам пасьпяховай барацьбы за прамфінплян 4-га заключнага году першай пяцігодкі.

На заклік ленінградзкіх рабочых сустрэць XV гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі новымі перамогамі на ўсіх участках сацыялістычнай будоўлі, рабочыя Барысаўшчыны, як і ўся рабочая кляса Савецкай Беларусі, горача адгукваецца павышэньнем свайго творчага энтузіязму. Задача партыйнай арганізацыі па-бальшавіцку ўзмачніць гэты энтузіязм, памагчы ўсе свае сілы на ліквідацыю дапушчанага адставаньня ў рабоце прамысловасьці. Пабаяўшы ліквідаваць адставаньне, цьвярстаць упушчанае, забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчай праграмы па ўсіх паказальніках—важнейшая задача бальшавікоў Барысаўшчыны.

За ўпартую бальшавіцкую работу, за бадзёрую мабілізацыю рабочых мас на барацьбу за заваяваньне месца ў перадавых радах барацьбітоў за прамфінплян 4-га заключнага!

*За 1.360 тыс. га азімых і 1.500 тыс. га зяблёва*

## *Якасьць апрацоўкі і тэрміны рашаюць посьпех сяўбы і зяблёва*

### Трактары больш прастойваюць, чым працуюць

ВІЦЕБСК. Абвешчаны ЦКК РСІ і «Правдой» усесаюзны рэйд нізавога друку аб праверцы скарыстаньня трактарнага парку яшчэ не знайшоў водгуку з боку віцебскіх раённых арганізацый. РСІ ў рэйд ня ўключылася, маўчыць і раённая газэта, а віцебская МТС аб рэйдзе нават нічога і ня ведае.

Між тым становішча Віцебскай МТС патрабуе карэннага аздараўленьня. У ліпені з прычыны няспраўнасьці трактараў, несвоечасовага падвозу гаручага і змазачнага матар'ялу трактары МТС мелі 3.598 трактара-гадзін прастою. Апрача гэтага, 84 дні трактары зусім не працавалі.

Ліпеньскія урокі дырэкцыяй МТС ня ўлічаны і зараз, у часе асеньняй сяўбы і зьляцьцця зяблёва. Ні адзін трактар ня выконвае сваёй нормы—18-20 гадз. у суткі. У сярэднім трактар «Ф. П.» працуе 9 з пал. гадз. у суткі, а «Інтар»—10 з пал. Адсюль ня дзіўна тое, што на сёнешні дзень узьнята зяблёва толькі 500 га.

Ня лепш працуюць трактары і на малацьбе. Замест 10 тон у суткі трактары абмалочваюць ня больш 7-7 з пал. тон.

Ня гледзячы на тое, што на ўсіх вучастках ёсьць загадчыкі, аграномы і важатыя калён, усё-ж вучасткі штодзённым апэрацыйным кіраўніцтвам не забясьпечаны. Толькі гэтым можна тлумачыць, што трактар карысная работы мае ўсяго толькі 50 проц. свайго часу.

На вучастку **В.-Лядчанскага** сельсавету дапушчаны многа халастых прагонаў трактараў. Трактарысты ня ведаюць загадзя сваёй работы. Іны звычайна заданьні атрымліваюць за 5 мінут да выезду. З гэтай прычыны 3 трактары прастаялі 3 дні і замест 32 кгр. гаручага на га расходавалі на 62 кгр.

Трактары, асабліва «Ф. П.», няпоўнасьцю забясьпечаны запаснымі часткамі. На ўсе патрабаваньні МТС аб дасылцы запасных частак Белкалгасцэнтр адказвае маўчаньнем. З 9 паўскладаных малатарапь, дасланых у МТС, толькі дзьве маюць шківы. Сноп навязалкі таксама дасланы без валоў. Трактарныя плугі ў большасьці дасланы бяз лемехаў і адвалаў. Гэта паслужыла прычынай 5-цідзённага прастою 5 трактарных плугоў.

Віцебская МТС сваёй рамонтнай майстэрні не мае. Ёсьць кузьня і тая не абсталявана. Трактарысты-ж па месяцох ня маюць неабходнага для іх інструманту, як-та: напрэзак, напільнікаў і нават ключоў.

Дырэкцыя МТС не зварачае належнай увагі на бытавыя ўмовы трактарыстаў. 30 трактарыстаў забясьпечаны толькі 7 парамі абутку. Цёплай спэцвопраткі зусім няма.

Аб «апэрацыйным» кіраўніцтве дырэкцыі МТС можна меркаваць хаця-б па тым, што 12 верасьня кіраўнікі МТС яшчэ ня ведаюць работы трактарнага парку за жнівень, не гаворачы ўжо аб верасьні.

Усе вышэйпералічаныя факты патрабуюць ад дырэкцыі МТС зараз-жа па ходу выправіць недахопы з тым, каб у бліжэйшыя дні плян сяўбы і зяблёва быў поўнасьцю выканан.

**Арк. Зарубежны, Рыг. Вярхоўскі.**

### Уключыліся ва ўсесаюзны рэйд

РАГАЧОЎ. (Наш спэцкор.). РКК-РСІ і рэдакцыя раённай газэты «Камунар» уключыліся ва ўсесаюзны рэйд, абвешчаны «Правдой» і ЦКК-НК-РСІ СССР па праверцы выкарыстаньня трактарнага парку.

На вытворчыя вучасткі МТС і ў саўгасы накіраваны брыгадзіры для арганізацыі праверкі выкарыстаньня трактараў і ходу сяўбы азімых і зябі.

У праверцы якасьці рамонту трактараў прымаюць удзел ударнікі-спэцыялісты з МТС і трактарнай майстэрні.

Спэцыялісты ў часе праверкі будуць ліквідаваць недахопы ў рамонце трактараў. Навучаць як трэба рабіць дробны рамонт на полі і арганізоўваць работу трактарных атрадаў.

**Л. Ягорчанка.**

### Рэалізаваць узятыя на сябе абавязацельствы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Паслужны сьпіс гомельскай МТС кароткі. У часе пасеўнай яна была ў глыбокім тыле, адставала з поліваам, адстае з уборкі і не пасьпявае з чарговай задачай—асеньняй сяўбой.

Па калгасах раёну трэба засеяць 2.643 гэкт., з якіх 200 гэкт. шпаніцы. На 10 верасьня засеяна толькі 460 гэкт. Чаму такое адставаньне?

Старшы аграном Буракевіч адразу-ж знаходзіць адказ: «З прычыны спазьненьня правой сяўбы, позьняй уборкі яравых і зразумела спазьняемся з асеньняй сяўбой».

Знойдуцца яшчэ тысячы аб'ектыўных прычын і самакрытычных заўваг, за якімі ўсё-ж такі крыецца апартунізм, стаўка на самацёк і чарговасьць кампаній. Гэтым і тлумачыцца тое, што рад калгасаў нават яшчэ не падрыхтавалі глебу пад пасеў, не [illegible] на пасеньне.

Паводле пляну пасенны фонд калгасу складае 366 тон і страхавы 55 тон. На 10 верасьня пасенфонд ссыпан толькі на 48 проц., а да стварэньня страхавога фонду нават і не прыступалі.

Пасеў 200 гэкт. шпаніцы знаходзіцца пад патрозай, бо няма ящчэ ні аднаго кілёграма падрыхтаванага насеньня. МТС яўна бязьдзейнічае і чакае пакуль хто-небудзь прышле ім гатовае насеньне.

На якасьць прадпасеўнай апрацоўкі глебы не зварачаецца ўвага. Па раду калгасаў сартаваньне насеньня не праводзіцца. Вывазка гною таксама яшчэ не распачата. Між тым тэрміны сяўбы ўжо праходзяць.

У адказ на ліст ленінградзкіх рабочых рад калгасаў раёну абавязаліся пасьпяхова скончыць сяўбу. Гэта абавязацельства калгасам Гомельшчыны павінны рэалізаваць у бліжэйш[illegible]

**Н. Гофман.**

### Скончылі сяўбу

ЕЛЬСК. Саўгас «Дабрынь» поўнасьцю скончыў сяўбу азімых на плошчы 130 гэкт. За выкананьне гэтага пляну ўпарта і настойліва змагаўся рабочы калектыў.

24 лепшых рабочых ударнікаў прыміраваны прамтаварамі і грашыма.

Зараз усе сілы саўгасу пераключаны на падрыхтоўку да ўборкі бульбы.

**Зуевіч.**

### Убяром табак і канопліі, тады пачнем сяўбу

ХОЙНІКІ. Ужо мінаюць устаноўленыя тэрміны сяўбы. Сяўба ў раёне павінна была пачацца яшчэ 20 жніўня, але для кіруючых работнікаў райза, МТС і райкалгасаюзу Хойніцкага раёну гэта не абавязкова. У іх ёсьць свае тэрміны.

Дырэктар МТС тав. Лаўрыновіч па бюро РК КП(б)Б проста заявіў: «убяром табак і канопліі, а потым возьмемся за другія кампаніі».

Апартуністычнай тэорыі «чарговасьці» прытрымліваецца ня толькі адзін Лаўрыновіч. У выніку — па 10 верасьня засеяна толькі 3.351 гэкт., або 25,8 проц.

Ачыстка насеньня ня робіцца. Сяўба праводзіцца выключна ручным спосабам у той час, як ёсьць радковыя сеяркі. На ст. Хойнікі ляжыць угнаеньне і ніхто не клапоціцца, каб вывезьці яго на палі калгасаў і саўгасаў.

**М. І.**

## НА СЛУЧЧЫНЕ НЯМА БАЛЬШАВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗБОЖЖА

### Тэмпы збожжазагатовак па БССР

(у процантах да гадавога пляну)

Загатоўлена да 5 верасьня

| Калгасамі | Аднаасобн. | Памольн. збор | Па БССР |
|---|---|---|---|
| 24 проц. | 2,8 проц. | 10,6 проц. | 10,6 проц. |

Загатоўлена да 10 верасьня

| Калгасамі | Аднаасобн. | Памольн. збор | Па БССР |
|---|---|---|---|
| 27,2 проц. | 4,2 проц. | 11,9 проц. | 12,0 проц. |

### 8 калгасаў не пачалі здачы збожжа

СЛУЦАК.

Слуцкі раён — адзін з асноўных збожжазагатоўных раёнаў БССР,—выканаў да 10 верасьня свой гадавы плян на 15,5 проц. Трэба здаць 3,150 тон, загатоўлена 491.

У той час, як калгасы выканалі гадавы плян на 26,8 проц. — здалі 403 тоны, аднаасобны сэктар здаў 11,3 проц. або 187 тон.

Асноўнай прычынай адставаньня Случчыны зьяўляецца няўменьне ўвязаць важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі па вёсны — абмалот, сьпартаваньне і здачу збожжа. «Тэсрыя чарговасьці кампаній» зрывае пасьпяховае выкананьне пляну загатовак.

Калі за першую пяцідзёнку верасьня было загатоўлена 4,2 проц. гадавога пляну, дык за другую — толькі 1,1 проц. Сельсаветы **Беліцкі, Лучнікаўскі і Цараўскі** за пяцідзёнку ня здалі ніводага кілё збожжа.

Патуральне кулацтву ў **Даравінскім, Беліцкім і Прошчацкім** сельсаветах прывяло да таго, што па цьвёрдых заданьнях паступіла ў іх ня больш чым па 0,5 тоны.

Кулак усімі спробамі імкнецца захаваць збожжа, сарваць дзяржаўныя загатоўкі. У Кастрычніцкім сельсавеце кулак **Дубіна** прывёз на прыёмны пункт авёс, у якім на 35 проц. было пяску. Кулак **Шнек** з вёскі Ляды прывёз 3 мяхі жыта, на перны погляд добрага, якое ўнізе было на 50 проц. зьмешана з пяском. Шкодлікі затрыманы і адданы пад суд.

Аб тым, што Случчына мае ўсе магчымасьці выканаць плян, што ўсё залежыць ад арганізацыі загатовак, сьведчыць работа **Палікарпаўскага і Амговіцкага сельсаветаў і Слуцкага гарсавету,** якія загатовілі ад 23 да 42 проц. гадавога пляну.

Ёсьць калгасы, якія ўжо перавыканалі гадавы плян: **імя Сталіна, Палікарпаўскага сельсавету, «Расьсьвет», Прошчыцкага.**

Там, дзе не праведзена выхаваўчая работа сярод калгасьнікаў, дзе яшчэ пануюць дробнабуржуазныя настроі, там збожжазагатоўкі — на мёртвым пункце. Не прыступілі да загатовак 8 калгасаў — **«Новае гарадзішча», «Ануфравічы», імя Дзяржынскага, «Чырвоны тарфавік», «Чырвоная зара», «Чырвоная ніва»** і інш.

Слуцкая партыйная арганізацыя павінна, на аснове масавай работы, вывесьці Случчыну на перадавыя пазыцыі збожжазагатовак.

**Папоў, Харытончык.**

### Чырвоны абоз аднаасобнікаў

**БАБРУЙСК (Белта). 8 ВЕРАСЬНЯ ПРАЦОЎНЫЯ І АДНААСОБНІКІ КАПУСЬЦІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ АРГАНІЗАВАЛІ ПЕРШЫ Ў РАЁНЕ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ. У АБОЗЕ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ АДНААСОБНІКІ — БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЁСАК ВЯЗЕЎКА, КРЫПЛІЦА, КАПУСЬЦІНА І ВІКТАРАЎКА. ЗДАНА НА ЗАГАТОЎЧЫ ПУНКТ «ЗАГАТЗБОЖЖА» 3,5 ТОНЫ.**

**АБОЗ БЫЎ АРГАНІЗОВАН ПАСЬЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АГУЛЬНЫХ СХОДАЎ І ШЫРОКАГА АБГАВАРЭНЬНЯ ПЛЯНАЎ ЗАГАТОВАК СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ.**

### Прэміі—ударнікам загатовак

У сваёй пастанове аб ходзе збожжазагатовак па калгасах Белкалгасцэнтр адзначыў, што тэмпы збожжазагатовак не забясьпечваюць выкананьня месячнага пляну і ажыцьцяўленьня лёзунгу, высунутага перадавымі калгасамі аб поўным выкананьні заданьня да 15 гадавіны Кастрычніка. Асабліва недапушчальна адстаюць калгасы ільнаводча-малочнай зоны, якія выканалі гадавы плян толькі на 10 проц.

Белкалгасцэнтр указаў **Быхаўскаму, Кармянскаму, Чэрыкаўскаму, Чырвонапольскаму, Уваравіцкаму і Асіпавіцкаму** райкалгасаюзам на недазвальняючую мабілізацыю калгасных мас на барацьбу за збожжа. Усім праўленьням калгасаў прапанавана шырока прапрацаваць на агульных сходах калгасьнікаў адозву калгасу «Камінтэрн-2», Дзяржынскага раёну.

Узятыя хадайніцтва перад збожжавай нарадай пры камітэце загатовак аб прэміяваньні калгасаў **Жыткавіцкага раёну,** якія выканалі гадавы плян. Павінны быць таксама прэміраваны за перавыкананьне пляну калгасы **«Чырвоны захад»** і **«Сталіна,** Заслаўскага раёну, **імя Гея,** Асіпавіцкага раёну, **«Новае жыцьцё»,** Старобінскага, **«Зара волі»** Капыльскага, **«12-годзьдзе Кастрычніка»,** Жлобінскага, і **«Чырвоная Зорка»,** Барысаўскага раёну.

### АБ АРГАНІЗАЦЫІ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК У АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ

Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б ад 5-IX 32 г.

1. Бюро гаркому адзначае, што пры пасьпяховым правядзеньні жнівеньскага пляну збожжазагатовак па раёну (жнівеньскі плян выкананы на 102 проц.) збожжазагатоўкі па аднаасобным сэктары праходзяць зусім нездавальняюча (на 31-VIII выканана 3 проц. гадавога пляну), а па асобных сельсаветах, як Прыгарадны, Круніцкі і Бараўскі аднаасобны сэктар да гэтага часу зусім ня прымаў удзелу ў збожжазагатоўках.

Выходзячы з гэтага, бюро гаркому паста наўляе:

1. Сакратаром сельпарт'ячэек у трохдзённы тэрмін праверыць давядзеньне пляну збожжазагатовак да вёсак і двара і дзе пляны не даведзены, тэрмінова давесьці іх. Пры давядзеньні пляну да двара разгарнуць масавую растлумачальную работу, якая-б дапамагла шырэйшым масам калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў усьвядоміць сувязь паміж збожжазагатоўкамі і ўсім ходам выкананьня народна-гаспадарчага пляну.

2. Прапанаваць усім сельпарт'ячэйкам да 15-га верасьня г. г. абгаварыць на шырокіх сходах калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў заклік перадавых калгасаў «скончыць загатоўкі да 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі» і заклік пралетараў Ленінграду, арганізуючы сацыяборніцтва паміж вёскамі і сельсаветамі на хутчэйшае выкананьне і перавыкананьне пляну загатовак.

3. Арганізаваць буксірныя брыгады з беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, выканаўшых заданьне за жнівень месяц, для аказаньня дапамогі адстаючым сельсаветам: брыгады Ратамскага сельсавету аказваюць дапамогу Бараўскаму сельсавету, Гатаўскага — Падгайскаму, Самахвалавіцкага — Круніцкаму і Трасьцянецкага — Каралішчавіцкаму.

Для кіраўніцтва і дапамогі буксірным брыгадам камандыраваць Макарэвіча ў Круніцкі сельсавет. Роява-у Падгайскі сельсавет, Граблёўскага — у Бараўскі і Дуберштэйна — у Каралішчавіцкі. Тэрмін выезду — 9-IX—32 г.

Сакратаром сельпарт'ячэек правесьці пасылку буксірных брыгад унутры сельсаветаў у адстаючыя вёскі, забясьпечыўшы гэтыя брыгады партыйным кіраўніцтвам.

4. Прапанаваць парт'ячэйкам і сельсаветам неадкладна давесьці цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможнай часткі, строга ўлічваючы кожны кілёграм, які павінен быць здан па цьвёрдых заданьнях. Аміраючыся на калгасьнікаў і беднату, дабіцца, каб цьвёрдыя заданьні былі выкананы да 20-га верасьня 1932 г., забясьпечыўшы рашаючую барацьбу з усякімі спробамі кулацка - заможных элементаў сабатаваць збожжазагатоўкі.

5. У сувязі з паяўнымі фактамі ў радзе вёсак гандлю збожжам, бюро ГК прапануе сельпарт'ячэйкам і сельсаветам дабіцца на справе правядзеньня дэкрэту ўраду аб збожжазагатоўках і пастановы аб забароне гандлю збожжам да 15 студзеня 1933 г., разгарнуўшы шырокую растлумачальную работу ў калгасах і вёсках вакол гэтых пытаньняў. Прыняць самыя суровыя меры, кіруючыся пастановай ЦК ад 31-VIII—32 г. супроць спэкулянтаў-перакупшчыкаў, кулакоў, зрываючых збожжазагатоўкі.

6. Абавязаць судовыя органы і органы пракуратуры ў тэрміновым парадку разглядаць справы аб спэкуляцыі збожжам, арганізуючы паказальныя суды пад спэкулянтамі.

7. Фракцыі гарсавету па працяжу пэкады праверыць выкананьне пляну збожжазагатовак па ўсіх сельсаветах, асабліва цьвёрдых заданьняў.

6. Абавязаць сельпарт'ячэйкі, сельсаветы, райзагатэбожжа і фракцыю ГКС прыняць усе меры, каб за верасень месяц збожжазагатоўкі былі выкананы па менш, як 50 проц. гадавога пляну.

9. На чарговым пасяджэньні сакратарыяту ГК заслухаць даклады старшынь сельсаветаў і сакратароў парт'ячэек Прыгараднага, Круніцкага, Бараўскага, Падгайскага і Сочыніцкага аб ходзе збожжазагатовак.

10. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

**Сакратар Менгаркому КП(б)Б ШПЭКТАРАЎ.**



Адпраўка збожжа пасьля абмалоту на ссыпны пункт.

19-га верасьня роўна ў 11 гадз. раніцы Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б склікае ў Менску **НАРАДУ АГІТМАСАВУ ГАРКОМАЎ ПРАМРАЕНАЎ, ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІХ ЯЧЭЕК І ГРУПАВЫХ АГІТАТАРАЎ** з наступным парадкам дня:

**1. Як перабудава агітмасавая работа пасьля прамовы тав. КАГАНОВІЧА і пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК**—дакл. тав. **Лецнэра** і садклады з месц.—Гомельшчына, Дэпо—Гомель, «Бальшавік», «Кастрычнік»—Менск, Сьцяг Індустрыялізацыі»—Віцебск.

**2. Арганізацыйныя пытаньні агітмасавай работы**—дакл. тав. **Ашаровіча.**

На нараду выклікаюцца—агітмасы: Гомелю, Віцебску, Бабруйску, Магілеву, Барысава, Воршы, Рэчыцы, Жлобіну, Полацку, Мазыра і Шклова; агітмасы, ячэек і групавыя агітатары: Гомельмашу—2, Бабруйскага камбінату—2, «Сьцяг Індустрыялізацыі»—2, шоўкавай фабрыкі—2, «Добруш»—1, завод імя Ланцуцкага—1, дэпо—Гомель—1, «10 кастычнік»—1, Белдрэв—1, акулярная фабрыка—1, віцебскае дэпо—1, скурзавод імя Сталіна—1, «Дзьвіна»—1, «Палесьдрук»—1; кіраўнікоў агітколектываў: Гомелю—2, Віцебску—2, Магілеву—1.

**Нам. заг. агітмасавага аддзелу ЦК — Н. Лецнэр.**

# Забясьпечыць сваячасовую здачу грошай па пазыцы

## Аб міжраённым спаборніцтве ня ведаюць

На днях калегія НКФ БССР пад старшынствам тав. **Хацкевіча** заслухала даклады прадстаўнікоў чатырох адстаючых па мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі раёнаў — **Лепельскага, Нараўлянскага, Прапойскага і Рэчыцкага.**

У той час, як рад раёнаў дабіліся рашучых перамог на фінансавым фронце, **Нараўлянскі** раён на 1 верасьня квартальны плян выканаў па 39,2 проц., **Прапойскі** — на 49,1 проц. І так з кварталу ў квартал. Варта асобна адзначыць зусім нездавальняючыя вынікі барацьбы за фінплян Рэчыцкага раёну, які, ня ў прыклад іншым пралетарскім цэнтрам БССР, выканаў квартальны плян толькі на 45 проц. Ня лепш становішча і па Лепельскім раёне, дзе квартальны плян выкананы на 55,2 проц.

Апошнія дырэктывы партыі і ўраду аб стварэньні рашучага пералому ў справе мабілізацыі сродкаў не знайшлі належнага адбітку ў рабоце ўказаных раёнаў.

На пасяджэньні калегіі выявілася, што раённыя фінансавыя арганізацыі **Нароўлі і Прапойску** няўважліва адносяцца да дырэктыў аб формах і мэтадах масавай работы. Ня чым іншым, як нежаданьнем выконваць дырэктывы ЦК і ЦКК, а таксама Наркамфіну можна вытлумачыць факт, што загадчыкі з **Нараўлянскага** райфа тав. **Аксючэнка** і **Прапойскага** тав. **Раткевіч** нічога ня прынялі да разгортваньня міжраённага і ўнутрыраённага сацспаборніцтва, па сацыялістычным заказе, які дан ім НКФ і ЦП саюзу фінбенкаўскіх работнікаў. Нічога не зрабілі ў напрамку арганізацыі дапамогі гораду вёсцы, і іншых бальшавіцкіх мэтадаў работы, якія правялі паасобныя раёны БССР і якія забясьпечылі гэтым раёнам перамогу на фінансавым фронце.

— **Нараўлянскі, Прапойскі** і інш. раёны, — як адзначыў тав. Хацкевіч, — па сутнасьці вядуць сваю фінансавую работу замкнута, першабытна, адарвана ад мас, яны імкнуцца памабілізаваць столькі сродкаў, каб хапіла ім на ўтрыманьне апарату свайго раёну і ніколькі ня думаюць аб інтарэсах дзяржавы ў цэлым.

Фінансава-крэдытныя арганізацыі гэтых раёнаў шо разумеюць таго, што забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў і плянаў паступленьня даходаў з аграмаджанага сэктару — першачарговая задача работы. Выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па разгортваньні таваразвароту, на зьніжэньні сабекошту ў прамысловасьці і будаўніцтве, захаваньне строгай эканоміі сродкаў — ёсьць непасрэдная работа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці раёнаў і ў першую чаргу фінансавага апарату. Выконваць гэту задачу, гэта значыць узмацняць фінансавую магутнасьць і абароназдольнасьць Савецкага саюзу, гэта значыць узмацняць тэмпы выкананьня ўсяго народнагаспадарчага пляну.

Калегія НКФ БССР адзначыўшы, што да гэтага часу па паказаных раёнах ня прыступлена да выкананьня дырэктыў аб скарачэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў на 10 проц., і што райфа невыстарчальна праводзіць барацьбу за рэжым эканоміі, прапанавала **Рэчыцкаму, Нараўлянскаму, Прапойскаму і Лепельскаму** райфа неадкладна ўзмацніць работу з тым, каб да 1 кастрычніка поўнасьцю выканаць дырэктыву аб скарачэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў і забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў. (БЕЛТА)

## Толькі 4 калгасы ўнесьлі ўзнос па падпісцы

**Уваравіцкі** раён яшчэ да гэтага часу не ліквідаваў адставаньня і самацёку ў рэалізацыі пазыкі, дапушчанага з самага пачатку кампаніі. Апарат райвыканкамаў не забясьпечыў кіраўніцтвам і дапамогай ашчадныя касы на вёсны і не мабілізаваў іх на выкананьне пляну распаўсюджваньня пазыкі.

Настаўніцтва на сваёй канфэрэнцыі вынесла пастанову аб уключэньні у пазыковую эстафэту і дапамозе сельскім саветам ахапіць падпіскай на пазыку ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Аднак, яны гэтай работы яшчэ не разгарнулі.

РК ЛКСМ, які павінен быў на-баявому арганізаваць правядзеньне дэкадніка па распаўсюджваньні пазыкі, сарваў гэты дэкаднік. Пасланы райкамолам у сельскія саветы ўпаўнаважаныя або зусім не выязджалі, [illegible] карысьці.

У значнай колькасьці сельсаветаў, як, напрыклад, **Стара-Беліцкім, Рудзянецкім, Камінскім, Уваравіцкім** і інш., аблігацыі пазыкі, узятыя старшынямі сельсаветаў для рэалізацыі за наяўны разрахунак, ляжаць бяз усякага руху ў шафах.

Райкамсод і камісіі пры сельсаветах, а таксама райкалгасаюз ня кіруюць справай распаўсюджваньня пазыкі, у выніку чаго ў **Ліпскім** сельсавеце дагэтуль падпіска па пазыку не афармлена, прычым пазыкай не ахоплены нават члены сельсаветаў і актыў, ня кажучы ўжо аб калгасьніках і аднаасобніках.

У калгасе «Прасьвет», які знаходзіцца ў самым раённым цэнтры, дагэтуль не праведзена падпіска. З ахопленых падпіскай калгасаў першыя ўзносы ўнесьлі толькі 4 калгасы: **«Першамайскі», імя Леніна, ім. Будзённага, «Новае жыцьцё».**

Райпрафсавет дагэтуль нічога не зрабіў па рэалізацыі пазыкі, з вызначаных ім шматлікіх брыгад для дапамогі сельскім саветам, **на раён выяжджала толькі 5 чалавек.** Ён ня кіруе таксама ходам падпіскі на прадпрыемствах, у выніку значны процант членаў саюзу не ахоплен падпіскай яшчэ да гэтага часу.

Усё гэта здарылася таму, што з [illegible] распаўсюджваньня на[illegible] насьць, самаці[illegible] пазыкі ёсьць безадказн[illegible] пежаданьне на прыкладзе [illegible] арганізаваць гэту работу. Партыйныя ячэйкі і сельсаветы амаль што зусім бязьдзейнічаюць. Яны не папулярызуюць сярод [illegible] жас значэньня пазыкі.

Райвыканкамы дагэтуль не раздалі аблігацый «трэцяга рашаючага» рабочым і служачым, а калгасы па гэтай пазыцы яшчэ ня ўнесьлі 15.000 руб.

**Зараз раён уключыўся ў правядзеньне пазыковай эстафэты. Адбылася нарада партактыву, выслалі ў раён упаўнаважаных, якім даны ўказаньні забясьпечыць поўнае выкананьне заданьня не пазьней 25-га верасьня.**

**А. Казіміраў.**

## Клімавіцкі раён перавыканаў фінплян III кварталу

КЛІМАВІЧЫ, 13. (Па тэл.). Правільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, шырока разгарнуўшы масавую работу, працоўныя Клімаўнічыны фінплян трэцяга кварталу на 20 верасьня выканалі на 103 проц., рэалізацыю пазыкі «4-ты заваршальны»—на 100 проц. Вядзем далейшую барацьбу за фінплян. Пасылаем буксірную брыгаду ў Касьцюковіцкі раён. Запэўняем ЦК, што пляны чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі будуць перавыкананы.

**Аўласенка, Вінаградаў, Шакурын, Меляшкевіч.**

## Чаму ў Рагачове не разданы падпісчыкам аблігацыі?

**РАГАЧОЎ, 13. (Белта).** Праведзены Рагачоўскай РКК-РСІ рэйд выявіў, што ў райвыканкамасе да гэтага часу ляжыць нявыданых на рукі падпісчыкам на 21.850 руб. поўнасьцю аплочаных аблігацый пазыкі «3-ці рашаючы». Кіраўніцтва райвыканкамасы, у асобе тав. **Цьфрульнікава,** безадказна адносіцца да выкананьня дырэктыў урадавых органаў аб сваячасовай раздачы падпісчыкам поўнасьцю аплочаных аблігацый.

Такое-ж становішча ёсьць і па асобных калектывах рабочых і служачых. У заўкоме Рагачоўскага райкамбінату ляжыць 110 руб. аблігацый пазыкі «3 рашаючы» і нават 360 руб. «5 у 4 года», неразданых рабочым. Камісія садзейнасьці і заўком райкамбінату лічаць такое зьявішча зусім нармальным і нічога ня робяць, каб паскорыць раздачу аблігацый.

На лесазаводзе імя Халтурына не раздана падпісчыкам на 5.595 руб. аблігацый, што складае 35 проц. сумы падпіскі на гэтую пазыку на заводзе. Адміністрацыя лесазаводу і кіраўнікі заводжай ашчадкасы тлумачаць нераздачу аблігацый тым, што быццам «рабочыя ня ідуць за атрыманьнем аблігацый». Камісія садзейнасьці лесазаводу бязьдзейнічае. Па кардоннай фабрыцы імя Сталіна таксама не раздана аблігацый на 1.555 руб.

Старшыня камісіі садзейнасьці рагачоўскага пэдтэхнікуму **Гайшун,** атрымаўшы з райвыканкамасы на 2 тыс. руб. аблігацый пазыкі «3 рашаючы», насіў іх у кішэні да таго часу, пакуль ня згубіў, а студэнты засталіся без аблігацый.

Ёсьць факты растраты атрыманых па падпісцы на пазыку грошай асобнымі адказнымі ас[illegible]ікамі. Напрыклад, загадчык Гарадзецкага лесазаводу **Гаўлін** утрыманыя па падпісцы на пазыку «3 рашаючы» грошы ад рабочых і служачых лесазаводу прысвоіў сабе. Зараз ён цераехаў на працу ў м. Піхінічы, а работнікам заводу, якія выплацілі поўнасьцю грошы па падпісцы, аблігацыі ня выданы і да гэтага часу. Калгасьнікі калгасу «Герой», Асеўніцкага сельсавету, унесьлі грошы за пазыку «3 рашаючы» старшыні калгасу **Панцялееву** ў суме 355 руб., аднак, **Панцялееў** гэтыя грошы ня ўнёс у ашчадкасу, а прысвоіў сабе. У выніку калгасьнікі аблігацый таксама не атрымалі.

Неабходна райпрокуратуры тэрмінова заняцца высьвятленьнем гэтых пытаньняў і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.



Выгляд на плаціну Дняпроўскай ДЭС з верхняга цячэньня Дняпра.

## ПАПЯРЭДЗІЦЬ РАЗЬУРЭНЬНЕ ПАДЗЕМНАЙ КАБЕЛЬНАЙ СЕТКІ АТС

Да XV гадавіны Кастрычніка ўступае ў строй **Менская АТС,** абсталяваная паводле апошняга слова тэхнікі. Гэта буйная перамога у справе паляпшэньня дабрабыту пралетарскай сталіцы.

Асноўным недахопам тэхнічнага абсталяваньня існуючай тэлефоннай станцыі зьяўляецца падземная сетка праводоў. Яна не абаронена ад усялякіх атмасфэрных уплываў (галалёду, ударау навальніцы і г. д.), а таксама і ад мэханічных пашкаджаньняў. Больш 70 проц. усіх перабояў тэлефоннай сувязі можна аднесьці за лік падземнай лініі. Таму, для забясьпечэньня надзейнай і бесьперабойнай работы аўтаматычнай тэлефоннай станцыі, уся сетка яе праводоў заключана ў сьвінцованыя кабелі, пракладзеныя ў падземнай бэтоннай каналізацыі.

Здавалася-б, што такая праводка найбольш гарантуе сетку ад пашкоджаньняў. Але ў чэрвені г. г. выбылі са строю некаторыя кабелі на Пляцы Волі, на Доўгабродзкай і Шпітальнай вуліцах.

Навукова-дасьледчай станцыяй Беларускага Кіраўніцтва Сувязі выяўлена, што прычынай пашкоджаньня падземна-тэлефонных кабеляў, а таксама ўсіх іншых падземных мэталёвых праводак зьяўляюцца блукаючыя электрычныя токі. Гэтыя токі выклікаюць электралітнае разьяданьне мэталёвых частак, у прыватнасьці — на тэлефонных кабелях — сьвінцу. Разьяданьне сьвінцу дапускае з зямлі вільгаць да провазу і яны псуюцца. Асноўнай прычынай зьяўленьня ў зямлі блукаючых токаў зьяўляецца дрэнная пракладка трамваю.

З тэй прычыны, што рэйкі, па якіх ідзе ток, датыкаюцца да зямлі, частка току (часам да 50 проц.) уходзіць у зямлю. У залежнасьці ад токаправоднасьці грунту шлях гэтага току вельмі няпэўны, таму і называецца ён блукаючым. Сустракаючы на сваім шляху розныя мэталёвыя пракладкі, як напрыклад, ваданправодныя трубы, сьвінцовыя тэлефонныя электрычныя кабелі — блукаючыя токі цякуць па іх. Разьяданьне мэталю звычайна робіцца ў тых мясцох, дзе токі выходзяць з кабеляў у так зв. дадатнай зоне. Абсьледваньнем, праведзеным навукова-дасьледчай станцыяй, устаноўлена, што Пляц Волі, Савецкая з прылягаючымі да яе вуліцамі ад Пралетарскай да выстаўкі, а таксама Кастрычніцкая і частка плацу Парыскай Камуны знаходзяцца ў зоне, якая падпадае пад уплыў блукаючага току. Усе пракладкі ў гэтых раёнах разьяданьнем току паступова будуць выбываць з строю.

Блукаючыя токі пры наяўнасьці трамваю зьявішча памінучае, але пры правільнай праводцы трамваю іх уплыў можа быць зьведзены да мінімуму. Трэба толькі, каб трамвайным кіраўніцтвам пры пабудове і эксплёатацыі трамвайнай сеткі былі захаваны існуючыя правілы і нормы цэнтральнага электратэхнічнага савету.

На вялікі жаль, гэтага ня было пры праводцы Менскага трамваю. Трамвайным кіраўніцтвам не ўстаноўлен нагляд за становішчам сеткі і з прычыны нядбайных адносін да адпаведных правілаў пракладкі лініі пастаўлен пад пагрозу падземны кабель сеткі АТС. Пракладка веткі на Ляхаўку зроблена так, што ўзмацняецца зьяўленьне блукаючых токаў і гэтым павялічваецца разьяданьне кабелю тэлефону.

Праверкай устаноўлена, што на ўсю трамвайную сетку Менску ёсьць толькі 2 адсасваючых тока «фідэра», пры гэтым і яны аказаліся пашкаванымі. На Ляхаўскай ветцы ўстаноўкі «фідэра» зусім няма.

Такое становішча менскай трамвайнай лініі вядзе да таго, што на працягу 1-2 год уся кабельная сетка АТС будзе прыведзена ў поўную нягоднасьць.

Каб забясьпечыць пуск і бесьперабойную работу Менскай АТС трамвайнаму кіраўніцтву неабходна: тэрмінова адрамантаваць адсасваючыя токі «фідэра», устанавіўшы іх на ўсіх ветках. Пракласьці кантрольныя правады для праверкі рознасьці патэнцыялаў паміж кропкамі датыканьня адсасваючых фідэраў. Замяніць усе лёгкія і зношаныя рэйкі больш цяжкімі і ў першую чаргу на Ляхаўскай ветцы. Весьці пастаянны нагляд за становішчам рэйкавых шляхоў і тым, каб яны задавальнялі ўсім правілам і нормам цэнтральнага электратэхнічнага савету.

Не чакаючы правядзеньня ў жыцьцё вышэй пералічаных патрабаваньняў, кіраўніцтву АТС неабходна прыняць тэрміновыя захады для папярэджваньня далейшага разьяданьня кабеляў. Але гэтыя мерапрыемствы будуць зьяўляцца толькі паўмерамі і цалкам гарантаваць абарону кабелю ня могуць. Толькі ў тым выпадку калі трамвайная гаспадарка будзе знаходзіцца ва ўпарадкаваным стане, над ёй будзе пастаянны кантроль, толькі тады кабельная сетка АТС будзе ў бясьпечнасьці. Калі-ж трамвайная гаспадарка будзе знаходзіцца ў такім становішчы, як і зараз, дык усе мерапрыемствы па абароне кабелю з боку кіраўніцтва сувязі ніякага эфэкту не дадуць, і АТС будзе працаваць з вялікімі перабоямі і частымі астаноўкамі.

**Жабінскі.**

## Стварыць узорныя калгасныя рынкі

Калегія НК-РСІ БССР нядаўна абгаварвала пытаньне аб арганізацыі калгаснага гандлю. Калегія адзначыла рад скрыўленьняў дырэктыў партыі і ўраду па пытаньні аб калгасным гандлі. На некаторых рынках тавары шырокага спажываньня адпускаюцца сялянам толькі на пасьведчаньнях, загатоўчыя арганізацыі (Менск) вядуць на калгасных рынках масавыя загатоўкі сельгаспрадуктаў, асабліва дэфіцытных; дагэтуль не наладжана арганізацыйнае і куль турнае абслугоўваньне прыяжджаючых калгасьнікаў і аднаасобнікаў: няма сыстэматычнага нагляду за калгаснымі рынкамі, не арганізаваны культурныя чайныя; ларкі не забясьпечаны таварамі шырокага спажываньня. Дэпутацкія групы прадпрыемстваў прымаюць вельмі слабы ўдзел у арганізацыі калгаснага гандлю. Зусім дрэнна вядзецца барацьба са спэкуляцыяй на рынках.

Калегія НК-РСІ БССР прапанавала ўсім Гар. КК-РСІ, пры ўдзеле шырокай грамадзкасьці, праверыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб калгасным гандлі; прыцягваць да адказнасьці асоб, вінаватых у скрыўленьні дырэктыў: водпуск па пасьведчаньнях, таваразбмен і г. д.

Калегія пастанавіла прыцягнуць да суровай адказнасьці кіраўнікоў установаў, якія займаюцца загатоўкай дэфіцытных сельгаспрадуктаў на калгасных рынках у прамысловых цэнтрах.

Старшыням Менскага, Гомельскага, Віцебскага і Магілеўскага гарсаветаў даручана арганізаваць каля рынкаў па 2 заежджых двары для сялян, якія прыяжджаюць на рынкі.

Гарсаветам прапанавана ў месячны тэрмін закончыць пабудову неабходнай колькасьці ларкоў, крам для продажу з рук, у трохмесячны тэрмін пабудаваць студні і ваданправоды для абслугоўваньня прыяжджаючых на калгасныя рынкі.

**А. Фогарашы**

## Сацыял-дэмакратыя шукае выхаду з крызісу

Зацяжны характар крызісу, які абвяргае ўсе буржуазна-эклёкаўскія прароцтвы па гэты конт, далейшае яго абвастрэньне і пагыбленьне прыводзяць да таго, што і пытаньне аб **выхадзе з крызісу** ставіцца ў парадак дня ва ўсё больш рэзкіх формах. Іменна таму зараз больш чым калі-небудзь галоўнай задачай сацыял-дэмакратыі зьяўляецца ўтрымаць масы ад барацьбы за рэвалюцыйны выхад і зрабіць магчымым той выхад з крызісу, які шукае буржуазія—**на шляхох вайны і фашызацыі.** Для ажыцьцяўленьня гэтай задачы прадназначаны рознастайныя **манэўры** міжнароднай сацыял-дэмакратыі, якія хутка зьмяняюцца. Хуткая зьмена гэтых манэўраў неабходна таму, што разьвіцьцё эканамічных і палітычных падзей абвяргае кампартыям абвяржэньне ўсіх прароцтваў і прадказаньняў сацыял-дэмакратаў, таму, што ўсе абяцаньні і посылы сацыял-дэмакратыі масам аказваюцца хлусьлівей і падвадальствам. Усе гэтыя манэўры толькі па абмежаваным адрэзку часу здольны ўводзіць у эман пласты, якія знаходзяцца пад уплывам сацыял-дэмакратыі. Але чым больш абмяжован тэрмін дзеяньня такіх манэўраў, тым больш шматлікія яны, тым больш рознастайныя іх зьнешнія формы, тым больш блытана ўсё гота мноства новых лёзунгаў, праграм, «тэорый», якія сацыял-дэмакратыі хоча падсунуць масам, як выхад з крызісу.

Падыфіцкія манэўры для прыкрыцьця падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны, «абарона СССР», каб утрымаць масы ад падыходзячай барацьбы супроць небясьпекі інтэрвэнцыі; «лёзунгі адзінства», каб папярэдзіць стварэньне сапраўды баявога адзінага фронту клясавай барацьбы пралетарыяту супроць фашыцкай дыктатуры, супроць пастуленьня капіталу,—такія аспэўныя манэўры, пры дапамозе якіх сацыял-дэмакратыя, выконваючы сваю ролю галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі, аказвае непасрэднае палітычнае падтрыманьне спробам капіталістычнай клясы знайсьці выхад з крызісу.

Але сацыял-дэмакратыя ня можа абыйсьці мацаньнем аскае рабочым масам (на якія яе ўплыў больш або менш моцны) на пытаньне—як выбрацца ім з галечы, беспрацоўя і зьбяднеьня?

Дзе выхад з крызісу **для пралетарыяту?** Пры **відавочным разьходжаньні** в сапраўднасьцю дзяржкапіталістычных «тэорый», высунутых прыкладна з год назад, здавалася, што сацыял-дэмакратычныя «очковтиратели» не адважацца доўга ашукваць масы такім шляхам. Аднак, вопыт 1932 г., уключаючы апошнія месяцы і тыдні, гаворыць нешта іншае. Сацыял-дэмакратыя, праўда, для выгляду адкідвае тэрмін «дзяржкапіталізм» і як-бы адмаўляецца ад «тэорыі», якая вельмі нацярпела пад ударамі камуністычнай крытыкі і выкрыцьцяў, але затое інсцэніруе новыя «сацыялістычныя» манэўры, па мэтаду і мэтах такія-ж самыя. Для сацыял-дэмакратыі ўся сутнасьць у тым, каб мерапрыемствы буржуазіі, з дапамогай якіх яна скідвае ўвесь цяжар крызісу на плечы пралетарыяту, санкцыянаваць як «сацыялістычныя», прапагнуць у імя «сацыялізму». Сутнасьць у тым, каб выкарыстаць сацыялістычную фразэалёгію супроць рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту.

**Задача камуністычных партый—да канца выкрыць гэтыя манэўры сацыял-дэмакратыі.**

Ідэалёгічнаму «пагыбленьню» сацыял-дэмакратычных манэўраў прысьвечан рад друкаваных работ па пытаньнях аб выхадзе з крызісу і аб сацыялізьме. Успомнем для прыкладу: Курт Мэндэльсон «Капіталістычная гаспадарчая сыстэма ці сацыялістычная плянавая гаспадарка» (выд. Форвэртс, 1932 г.). Отто Фрыдэр «Шлях да сацыялістычнай плянавай гаспадаркі» (выд. тое самае).

Надзвычай сымптоматычны той факт, што ва Францыі стараецца новая літаратура, якая падае рэфармісцкія падвадальскія абяцаньні пад соусам рэвалюцыйнай фразэалёгіі. Так, Эдгар Мільо прапануе праграму «выхаду» з крызісу ў сваёй працы «Праект непасрэдных мерапрыемстваў супроць беспрацоўя і крызісу». Рэфармісцка-рэакцыйную ўтопію прапануе ў сваёй працы «Канструкцыйная рэвалюцыя» (Парыж, 1932 г.) Буавея, Дэйксон, Лефран.

Што агульнага ва ўсіх гэтых «сацыялістычных» праграмах і праектах выхаду з крызісу?

1) Падвадальская спэкуляцыя на паняцьцях «сацыялізм» і «плянавая гаспадарка».

2) Паняцьце надклясавай дзяржавы, як посьбіта мерапрыемстваў, якія быццам указваюць выхад з крызісу.

Абедзьве гэтыя характэрныя адзнакі с.-д. «манэўраў выхаду» ідуць па лініі прагрэсуючай фашызацыі сацыял-дэмакратыі.

З гэтага мноства падвадальскіх манэўраў спынімся толькі на «выратавальнай праграме» германскіх жоўтых прафсаюзаў, паколькі яна зьяўляецца так сказаць клясычным прыкладам для ўсіх другіх і апрача таго знайшла найбольш шырокае масавае распаўсюджаньне. У кароткіх уводзінах да праграмы гаворыцца:

«Прафсаюзы, прад'явіўшы ў мэтах зьмяншэньня эканамічнага крызісу і разгрузкі рынку працы патрабаваньне аб прадастаўленьні дзяржавай работы, цяпер дапаўняюць гэта бягучае патрабаваньне сваімі праграмнымі патрабаваньнямі ў адносінах эканамічнай палітыкі будучага. Усегерманскае аб'яднаньне прафсаюзаў і АФА сумесна з рядам вучоных экспэртаў распрацавалі ў МЭТАХ ПАПЯРЭДЖАНЬНЯ Ў ДАЛЕЙШЫМ ТАКІХ КАТАСТРОФ, ЯК ЦЯПЕРАШНІ ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС падкрэслена мной — А. Ф.), наступныя УКАЗАНЬНІ ДЛЯ ПЕРАБУДОВЫ ГАСПАДАРКІ».

Такім чынам праграма выратаваньня ставіць ня толькі «скромныя» задачы — знайсьці выхад з цяперашняга **сучаснага** крызісу. Рэфармісцкія лідэры прыступаюць да распрацоўкі дэтальнага пляну «перабудовы» гаспадаркі, які павінен папярэдзіць (вядома без пралетарскай рэвалюцыі) у будучым катастрофы накшталт цяперашняга крызісу.

Год назад Отто Бауэр і Карл Рэнэр віталі пераняцьце даўгоў збанкрутаваўшага ў Аўстрыі «Крэдытаншальт» у імя «сацыялізму». Іх прыкладу пасьледавалі Гільфердынг і Пафталі, якія абвяшчалі славутае «аздараўленьне» германскіх буйных банкаў таксама як крок да сацыялізму. А цяпер, калі дзяржава, пераймаючы гельзенкірхенскія акцыі, прыступае да «аздараўленьня» збанкрутаваўшых капітарнаў цяжкай індустрыі, сацыял-дэмакратыя пераходзіць да патрабаваньня адзяржаўленьня цяжкай індустрыі. Гэта—аспэўная ідэя «праграмы выратаваньня».

За падтрыманьне банкаў распаліліся працоўныя масы, якіх прымушаюць пакрываць мільярдныя страты германскага фінансавага капіталу. «Аздараўленьне» індустрыі паўтарае тое самае ў грандыёзным маштабе. І вось гэта рэфармісцкія жулікі называюць «рэарганізацыяй гаспадаркі».

Новыя законапраекты с.-д. фракцыі рэйхстагу заходзяць яшчэ далей, патрабуючы **«экспрапрыяцыі буйных памешчыкаў».** За «радыкальнай фразай, зразумела, ніякага іншага зьместу ня крыецца, апрача як зьмест тэй-жа праграмы. Сацыял-фашысцкія праектоўшчыкі, зразумела, зусім не патрабуюць **экспрапрыяцыі зямлі бяз выкупу,** а маюць на мэце кампэнсацыю памешчыкаў за кошт працоўных. Практычна гэта азначае дзяржаўнае «аздараўленьне» збанкрутаваўшых гаспадарак юнкераў за кошт мас. **Такім чынам экспрапрыяцыя застаецца на паперы, кампэнсацыя-ж памешчыкам тым ня менш будзе выплачана.**

Юнкерам прапануецца рэнта ў разьмеры іх гадавога даходу 1929 г.

Сацыял-фашысты звыш таго яшчэ паставілі сабе мэтай падсунуць масам выхад з **агульнага крызісу капіталістычнай сыстэмы.** Таму наша задача—паказаць сацыял-дэмакратычным рабочым, што «выратавальныя праграмы» сацыял-фашызму вядуць зусім не да сацыялізму, а да падтрыманьня і аздараўленьня капіталістычнай сыстэмы як такавой, што «сацыялізм», які агаланяецца ў гэтых праграмах як выхад з крызісу, ёсьць толькі псэўдонім капіталізму і іншым быць ня можа.

Праз усю праграму чырвонай ніткай праходзяць два сафізмы:

1) Цьверджаньне, што ўмяшальніцтва буржуазнай дзяржавы ў гаспадарку зьяўляецца «сацыялістычным» мерапрыемствам.

2) Падмена сацыялізму хлусьлівай фармулёўкай нейкага «пераходнага перыяду», які вядзе без пралетарскай рэвалюцыі да сацыялізму.

Утоесамленьнем дзяржкантролю і адзяржаўленьня з сацыялізмам карыстаюцца ў інтарэсах ашуканьня рабочых як сацыял-дэмакраты, так і нацыянал-сацыялісты.

Трэцяя аспэўная ідэя «праграмы выратаваньня»—гэта ідэя **плянавай гаспадаркі.** Праграма высоўвае патрабаваньне плянамернага разьмеркаваньня крэдытаў, плянамернага накіраваньня патоку капіталаў, стварэньня цэнтральнага плянавага органу і г. д. Ужо адны гэтыя фармулёўкі ясна паказваюць, што справа ідзе аб захаваньні капіталізму і аб патрабаваньні плянамернага ператварэньня капіталістычнай гаспадаркі, якое пярэчыць усякаму здаровому розуму. Але разам з тым ва ўяўленьні гэтага патрабаваньня аб плянавай гаспадарцы адбіваецца цяга рабочых мас да сацыялістычнай плянавай гаспадаркі, цяга, якую сацыял-дэмакратыя прабуе задаволіць рэакцыйна-бюракратычным патрабаваньнем стварэньня плянуючых органаў ва ўмовах капіталістычнай сыстэмы

***

Тэарытычнай базай усіх жульніцкіх трукаў і фокусаў сацыял-дэмакратыі заўсёды і пяльменна застасцца паняцьце надклясавай дзяржавы. Надвадальскія маніпуляцыі сацыял-дэмакратыі могуць мець посьпех толькі да таго часу, пакуль с.-д. рабочыя не ўявілі сабе клясавага характару імпэрыялістычнай дзяржавы. Сацыял-дэмакратыя добра гэта разумее і стараецца злучыць свае намаганьні, утрымаць рабочых ад барацьбы за рэвалюцыйны выхад і зрабіць іх зброяй капіталістычнага вырашэньня крызісу з ідэалёгічнымі манэўрамі, якія пастаянна абнаўляюцца і якія маюць мэтай утаіць характар капіталістычнай дзяржавы, а галоўнае, адносіны дзяржавы да капіталістычнай гаспадаркі і ўзаемаадносіны асобных дзяржаў у эпоху імпэрыялізму.

Адпэй з павейшых спроб у гэтым духу зьяўляюцца артыкулы Карла Рэнэра аб «унутранай Эўропе».

Артыкулы Рэнэра—падзвычай характэрны прадукт фашызацыі сацыял-дэмакратыі, фашызацыі, якая захоплівае нават манэру фармулёвак, спосаб выразаў. Рэнэраўскія выказваньні ў карысьць «буйнай па аб'ёме гаспадаркі», яго ўздыханьні аб «дробных дзяржавах, якіх задыхаюцца»,—усё гэта паказвае, што калі на больш ранным этапе ўзаемаадносін фашызму і сацыял-дэмакратыі першы атрымліваў ад апошняй неабходнае ідэалёгічнае падтрыманьне, то зараз сацыял-дэмакратыя многае пазычае ў фашызму, асабліва па частыя найбольш дзейсных мэтадаў падвадальства мас і дэмагогіі.

У данай сувязі нас цікавіць толькі Рэнэраўскі рэцэпт выхаду з крызісу. І тут мы бачым такі мэтад адшуканьня выхаду, які, ей-ей, ня ўступае па ступені «марксызму» растлумачэньням расійскага меншавіка Шыфрына:

«Няма нічога больш жудаснага, чым галеча, у пошуках усё новых і новых выхадаў яна бязупынна нараджае ілюзіі; яна ніколі не расчароўваецца канчаткова; калі адна ілюзія расплываецца ў нішто, дык галеча нараджае дзесяткі новых. І можа здарыцца, ШТО НАРЭШЦЕ АДНА ТАКАЯ ІЛЮЗІЯ, ПРЫ СПРЫЯЮЧЫХ АБ СТАВІНАХ, СТАНЕ САПРАЎДНЫМ ВЫХАДАМ (падкрэслена мной—А. Ф.). Па пітычным абставіны будучага ва ўслякім выпадку наўрад ці можна калі-небудзь упічыць». (Рэнэр, «Унутрыэўрапэйскія праблемы», «Кемпф» за чэрвень г. г.).

Рэнэр пад уплывам веры ў цуда прабуе выцягнуць з ілюзіі які-небудзь выхад. На практыцы гэта прыводзіць да таго, што Рэнэр перафразіруе плян Тард'е аб дунайскай федэрацыі, плян «унутрыэўрапэйскіх эканамічных раёнаў» і прапануе ангельскаму і францускаму імпэрыялізму на выбар багаты асартымэнт праектаў эканамічнага дзяленьня «ўнутранай Эўропы» аж да стварэньня «ўнутрыэўрапэйскага саюзу».

«Чыста эканамічны» выхад з крызісу, да якога прычаліла сацыял-дэмакратыя,—гэта **падрыхтоўка новых імпэрыялістычных войн,** у першую чаргу, вайны супроць СССР, гэта унутрыімпэрыялістычныя групоўкі, нязьменна завостраныя супроць тэй ці іншай імпэрыялістычнай вялікай дзяржавы; гэта па-ранейшаму закабаленьне Германіі і Аўстрыі; гэта капіталістычная спроба знайсьці выхад з крызісу, які пакуты, галечу і прыгнечаньне працоўных мас даводзіць да іх фізычнага зьнішчэньня вайной, голадам і фашысцкім тэрорам.

***

Было-б недаравальнай памылкай, калі-б камуністы недаацэньвалі ўплыву гэтых манэўраў па шырокія масы. Сацыял-дэмакраты-ж ужо ў значнай ступені выконваюць сваю ролю, калі яны сеюць мітусьню ў розумах рабочых, утрымліваюць іх ад барацьбы за рэвалюцыйны выхад, дыскрэдытуюць сацыялізм, паказваючы курс капіталістычных урадаў на ўзяцьце мас зморанасьцю, як крок да сацыялізму.

На жаль, камуністычныя партыі і іх друк вельмі мала аддаюць увагі выкрыцьцю с.-д. манэўраў адносна «выхаду» з крызісу.

Камуністы і рэвалюцыйныя прафсаюзы могуць пасьпяхова змагацца з падступнымі манэўрамі сацыял-дэмакратыі, з яе спробай падсунуць масам быццам «сацыялістычны» выхад з крызісу толькі ў тым выпадку, калі яны (г. зн. камуністы і рэвалюцыйныя прафсаюзы) канкрэтна паказуць масам, што гэта значыць—змагацца за рэвалюцыйны выхад з крызісу, а ня будуць, як гэта часта здараецца, абмяжоўвацца толькі пастаянным і настойлівым паўтарэньнем лёзунгу барацьбы за «рэвалюцыйны выхад». Яны павінны паказаць рабочым на прыкладзе канкрэтнай эканамічнай і палітычнай сапраўднасьці, што пастаноўка сацыял-дэмакратыяй «сацыялістычных» праграм мае толькі адну мэту—маскаваць бязупыннае пастуленьне капіталу на пралетарыят. Але звыш таго важна ўсё зноў і зноў несьці ў масы марксыцка-ленінскае **разуменьне дзяржавы,** расьсейваючы хлусьлівыя ілюзіі, якія распаўсюджваюць фашызм і сацыял-фашызм наконт «надклясавай» дзяржавы і ілюзіі надзеі на «сацыялістычныя» мерапрыемствы, якія быццам павінна правесьці дзяржава. Трэба растлумачыць, чаму «кантроль над банкамі», «плянавая гаспадарка», «аздараўленьне буйных прадпрыемстваў» у рамках капіталістычнай сыстэмы застаюцца толькі іллюзіямі лёзунгамі, якія прыкрываюць абвастрэньне эксплёатацыі і абагачэньне капіталістаў за кошт працоўных. Важна ўнесьці яснасьць у разуменьне сутнасьці **пераходнага пэрыяду,** да канца выкрыць злачынныя манэўры сацыял-дэмакратыі наконт пераходнага пэрыяду і ўсьвядоміць масам, што «пераходны пэрыяд ёсьць рэвалюцыя» (Ленін). Такая ўвязка рэвалюцыйнай мабілізацыі мас на барацьбу супроць эксплёатацыі, вайны і фашызму з бязьлітасной барацьбой супроць «тэорый» сацыял-фашызму і ёсьць сродак барацьбы з сацыял-дэмакратычнымі манэўрамі

# Больш творчай ініцыятывы

## У барацьбе за ўзорны цэх грамадзкага харчаваньня

Скончылася першая ўсебеларуская канфэрэнцыя кухароў. З усіх канцоў БССР—паўночных, паўднёвых раёнаў, асноўных пралетарскіх цэнтраў, буйнейшых прадпрыемстваў зьехаліся дэлегаты на сваю першую канфэрэнцыю.

Сабраліся загадчыкі сталовых, кухары, прадстаўнікі трыкутнікаў прадпрыемстваў, прафсаюзныя работнікі і дэлегаты рабочых заводаў.

На канфэрэнцыі майстры кулінарнай тэхнікі дзяліліся сваім вопытам барацьбы за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня, за добры смачны і танны абед.

Лепшая работніца кухні-сталоўкі зав. «Полымя рэв.» т. Конанава.

Дэлегаты заводаў ахарактарызавалі работу па стварэньні ўласнай харчовай базы, якая зараз разгортваецца на радзе прадпрыемстваў БССР.

Прадстаўнікі рабочых арганізацый прад'явілі свой рахунак сталоўкам--цэхам грамадзкага харчаваньня.

Старэйшы дэлегат канфэрэнцыі 70-ці гадовы кухар т. **Запрагайла** расказаў аб цікавых эпізодах з сваёй 40-гадовай кулінарнай практыкі. Ён кінуў кліч усёй канфэрэнцыі—**перадаць вопыт лепшых майстраў грамадзкага харчаваньня новым маладым кадрам, весьці штодзенную ўпартую барацьбу за паляпшэньне якасьці абедаў.** Тав. Запрагайла ўнёс рад каштоўных прапаноў, якія маюць мэтай палепшыць работу брафычна-заводзкіх сталовак.

Адзін за другім зьмяняліся дэлегаты на трыбуне.

Дэманструю актыўнасьць праявілі Віцебскія дэлегаты. У сваіх выступленьнях яны далі малюнак становішча грамадзкага харчаваньня ў адным з буйнейшых цэнтраў БССР.

З рапартам аб баявых перамогах на фронце грамадзкага харчаваньня, аб узорнай рабоце сталоўкі фабрыкі «Дзьвіна», якая заняла першае месца ў БССР, выступілі загадчык сталоўкі тав. **Ліфшыц** і старэйшы кухар т. **Сакольскі.**

— Пабудавана новае вялікае, сьветлае двухпавярховае памяшканьне. Кожны дзень рабочыя атрымліваюць добра прыгатаваны абед з двух блюд коштам у 50 кап. Куток ударніка лепшых эмкагры за прамфінплян атрымліваюць абед з 3-х страў за 39 кап. Куток дыэтнікаў—перны ў Віцебску, кождзень у меню сталоўкі красуюцца 18 рознастайных блюд. Усе тры зьмены абслугоўваюцца гарачымі абедамі.

Работнікі сталоўкі пераведзены на зьдзельчыну. Лепшае і хуткае абслугоўваньне рабочых, павышэньне прадукцыйнасьці працы, павялічэньне зарплаты—вось эфэкт добрай пастаноўкі зьдзельнай сыстэмы. 2 лічбы: за дзьве гадзіны афіцыянткі разносяць па 500—600 абедаў, афіцыянткі ў іншых сталоўках за 8 гадзін раздаюць толькі 800. Зарплата работніц сталоўкі павысілася з 74 да 89 р. у месяц.

Вялікая работа праводзіцца з абслугоўваючым персаналам. За 2 месяца праведзена 36 тэхнічных нарад па розных вытворчых пытаньнях. 70 проц. работнікаў ахоплены сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам.

Многа зроблена для стварэньня ўласнай харчовай базы. Ёсьць сьвінаадкормачны пункт на 267 шт. Пачалі будаўніцтва новага сьвінарніка. Шырока разгорнуты самазагатоўкі ў глыбінных пунктах.

Вынікі добрай работы сталоўкі станоўча адбіліся і на рабоце фабрыкі. Амаль што зьліквідавана цякучасьць рабочай сілы.

Вопытам добрай пастаноўкі работы падзяліліся з канфэрэнцыяй дэлегаты **Менскай абутковай фабрыкі,** сталоўка якой паказала ўзор перабудовы працы.

Зусім другі малюнак разгарнуў перад канфэрэнцыяй загадчык сталоўкі Гомельскага заводу імя **Ланцуцкага.**

— Памяшканьня для сталоўкі няма. Абеды разносяцца ў тэрмасах па цэхах. Дагэтуль існуюць стандартныя абеды: кожны дзень адно і тое-ж мэню. Дырэкцыя і грамадзкія арганізацыі фабрыкі ня цікавяцца работай сталоўкі. Ёсьць усе магчымасьці для добрай пастаноўкі харчаваньня (сьвінаадкормачны пункт, трусатнік, самазагатоўкі), але-ж дрэнная арганізацыя работы зводзіць на нішто гэтыя магчымасьці.

— Канфэрэнцыя павінна нам дапамагчы,—заявіў прамоўца—узьняць грамадзкую думку вакол работы нашай сталоўкі. **Машынабудаўнічы завод імя Ланцуцкага павінен мець узорны цэх грамадзкага харчаваньня.**

Шмат увагі аддалі дэлегаты пытаньню мэханізацыі кухні. Ёсьць рад выпадкаў, калі разныя машыны-бульбамойкі і інш. не скарыстоўваюцца (завод імя Варашылава, «Камунар», імя Ланцуцкага). Абсталяваньне для кухань, якое патрабуе нязначнага рамонту, валяецца ў цэхах заводаў «Камунар» і імя Варашылава па некалькі месяцаў.

Многа гаварылі аб ролі **кухара-інжынэра грамадзкага харчаваньня.** Ёсьць факты, калі кухары скарыстоўваюцца на такой рабоце, як колка дроў, носка вады. Яшчэ ня зжыта абязьлічка ў рабоце на кухні (фабрыка «Прафінтэрн», Віцебск); прадукты для гэтай сталоўкі закупаюць усе па чарзе, прапановы кухара ігнаруюцца.

Адмоўна адбіваецца на рабоце сталовак частая зьмена загадчыкаў. У сталоўцы Віцебскага заводу «Чырвоны мэталіст» за 12 месяцаў зьмянілася 10 загадчыкаў; у Гомельскай дыэтычнай сталоўцы кожны месяц новы загадчык.

У радзе сталовак наглядаюцца скрыўленьні ў арганізацыі самазагатовак. Замест загатовак у глыбінных пунктах, шкаторыя сталоўкі, як менская № 2, кухня-разьмеркавальнік, сталоўка № 12 і інш. купляюць прадукты на мясцовым рынку, што адбіваецца на цэнах на абеды.

Зьдзельчына ва многіх выпадках шкодзіцца чыста фармальна; ніякага ўліку работы няма, грамадзкія разрахункі не адчуваецца. (Завод «Камунар», імя Ланцуцкага і інш.).

Вялікім посьпехам на канфэрэнцыі карысталася выстаўка разнастайных блюд, падрыхтаваная лепшымі Менскімі сталоўкамі. Сталоўка №6 ТСТ (завод «Полымя рэвалюцыі») падрыхтавала 30 блюд, з іх 28 з гародніны. Менская абутковая фабрыка дэманстравала 34 блюды, у большасьці з гародніны. Сталоўкі заводаў «Камунар», «Бальшавік» таксама зьявілі на выстаўцы гапароваe месца.

Выстаўка ўзварушыла дэлегацкую масу. Яна стала агітатарам за шырокае ўкараненьне гародніны ў штодзеннае мэню, за далейшае паляпшэньне якасьці абедаў.

Якія вынікі дала ўсебеларуская канфэрэнцыя? Яна зрабіла вопыт лепшых сталовак—фабрыкі «Дзьвіна», Менскай абутковай, заводу «Полымя рэвалюцыі»—здабыткам усіх фабрычна-заводзкіх сталовак БССР.

Яна выразна падкрэсьліла ролю майстра кулінарыі—кухара ў справе паляпшэньня грамадзкага харчаваньня. Яна паставіла перад кожным дэлегатам задачу—раўняцца па лепшых кухарох-ударніках **Кірухіне** («Полымя Рэвалюцыі»), **Сакольскім**--(«Дзьвіна»), **Пятровічу** (Менская абутковая фабрыка), па лепшых загадчыках сталовых—**Ліўшыцу, Максіменку і інш.**

Канфэрэнцыя дала работнікам сталовак сацыялістычную пушёўку на далейшую барацьбу за стварэньне ўзорных цэхаў грамадзкага харчаваньня.

**Турэцкі.**

# Фарсаваць загатоўку і вывазку дроў у пралетарскія цэнтры

## Усё на тым-жа месцы

Пастановы партыі і ўраду — «да 1-га верасьня забясьпечыць пралетарскія цэнтры апалам» — ня выкананы. Плян адгрузкі дроў для прамысловасьці выкананы на 73 проц. Працоўнае насельніцтва буйнейшых гарадоў БССР забясьпечана дрывамі толькі на 50 проц.

Леспрамгасы, якія прымацаваны для забесьпячэньня апалам Менску ў 3 квартале, загатовілі **36.195** раўмэтраў замест 250 тысяч паводле плану. Заданьне па вывазцы за аднаведны перыяд выканана толькі на **19,4 проц.**

Узоры адставаньня паказваюць **Асіпавіцкі леспрамгас,** які выканаў заданьне па загатоўцы **на 12,3 проц.** і па вывазцы — на 15 проц.; **Чэрвеньскі леспрамгас ухітрыўся выканаць заданьне** па загатоўцы дравіны на 3,6 проц., па вывазцы — на 1,5 проц. Ня лепш працуюць Парыцкі, Жыткавіцкі і Старобінскі леспрамгасы. Парыцкі леспрамгас выканаў плян па загатоўцы па 28,9 проц. і па вывазцы — 20,2 проц.

Уласны транспарт леспрамгасаў нагружан толькі на 40-60 проц. Леспрамгасы ўсю віну за дрэнную работу транспарту ўскладаюць на адсутнасьць кармоў у той час, як самі толькі што сабралі новы ўраджай і поўнасьцю забясьпечаны сенам і аўсом.

Лесбел таксама нічога не зрабіў для выкананьня плянаў леспрамгасамі. Да гэтага часу толькі 9 леспрамгасам даны заданьні на вывазку дравіны ў 3 квартале уласным транспартам.

Лесасэкцыя не вядзе барацьбы за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня. Самазагатоўкі па лесрабкопах не разгорнуты. Рабочыя забясьпечваюцца дрэнна.

Арганізаваным наборам рабочай сілы леспрамгасы не займаюцца. Яны спадзяюцца выканаць пляны вывазкі дроў у парадку гужпавіннасьці.

Неабходна, каб кіруючыя органы раёнаў паставілі справу выкананьня лесазагатовак, як адну з першачарговых задач, узмацніўшы штодзеннае кіраўніцтва, кантроль і дапамогу леспрамгасам.

Работа Лесбелу, леспрамгасаў і ўсіх лясных устаноў павінна быць перабудавана ў аднаведнасьці з указаньнямі тав. Сталіна. Пляны рэальныя і іх можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць.

**Бедзрсон.**

## З-за непадачы паражняка зрываецца дастаўка дроў

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлефону). Леспрамгас спыніў вывазку дроў. Каля чыгункі налічваецца ня больш 50 вагонаў. Загадчык леспрамгасу чакае, пакуль забяруць тыя дровы, якія падвезены да чыгункі і не адгружаюцца на працягу 10 дзён.

**ПАЛЕЙ.**

* * *

АСІПОВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Каля чыгункі ляжыць 500 вагонаў дроў, якія павінны быць адгружаны Менску. Кіраўніцтва станцыі не падае вагонаў. На 29 жніўня леспрамгасам падана заяўка на 59 вагонаў, не атрымана ніводнага. На 30-га жніўня патрабавалася 69, а паданы 34 вагоны. 31 замест патрэбных 102 вагонаў падана для нагрузкі толькі 33.

**Гельфанд, Каўфман.**

* * *

ЗАСЛАЎЕ. (Па тэлеграфу). Леспрамгасам загатоўлена 13 тыс. куб. м. дроў. Звыш 1.000 куб. м. падвезена да дарог, а астатнія ляжаць у такіх мясцох, адкуль можна браць аўтамашынамі. Але да гэтага часу Менгартоп ня прыслаў свайго прадстаўніка для прыёмкі апалу.

Работнікі Гартопу вельмі многа гавораць аб дровах і нічога канкрэтнага ня робяць для таго, каб забясьпечыць вывазку з Заслаўскага леспрамгасу, пакуль не папсавалася дарога.

**З—і.**

## ДАСТАЎКА ДРОЎ МЕНСКУ

(У ВАГОНАХ І ПРОЦ.)

| 8 верасьня | 9 верасьня | 10 верасьня | 11 верасьня | 12 верасьня |
|---|---|---|---|---|
| 42<br>35,0 | 41<br>34,1 | 65<br>54,2 | 2<br>1,7 | 66<br>55,0 |

## Мэханізацыя выкаткі дасьць вялікую эканомію сродкаў

*(Ліст рабочага)*

У аспоўным лесапільную гэту забясьпечвае матар'ялам сырцовая база пры **Бабруйскім лесакамбінаце.**

З базы сырэц перавозіцца коньмі ў басэйн лесацэху.

Зразумела, што мэханізацыя перавозкі, замена коняй мэханізаванай дастаўкай, дала-б вялізарную эканомію. Гэта ўлічылі і ў 1931 г. пачата была пракладка вузкакалейкі для падачы калод у лесацэх камбінату.

Пракладку ня скончылі. А ў 1932 г. паводле загаду аднаго з тэхнікаў камбінату, вузкакалейку разабралі і замянілі яе паўтарымэтравым тратуарам.

Пытаньне аб замене вузкакалейкі тратуарам нідзе не абгаварвалася і невядома з якіх меркаваньняў зроблена. Шкода ад гэтай замены відавочна. Штодзенна камбінат пераплачвае перавозчыку калод, плоціць розьніцу за авёс і сена для коняй робіць буйныя затраты, непатрэбныя пры мэханізацыі базы.

На зімовы перыяд 1932 г. патрэбна выкаціць каля 200 тыс. кбм. дравіны, каб забясьпечыць бесьперабойную работу лесапільных заводаў.

На базе ёсьць два элеватары. і калі да гэтага дадаць яшчэ некалькі лябёдак, то можна было-б абыйсьціся і без коняй.

— Аднак, ня гледзячы на пастанову вытворча тэхнічнай нарады і лёкальны дагавор, падпісаны ў маі г. г., на сёньняшні дзень нічога ня зроблена.

У цагавоцы адзначаецца, што да 15 ліпеня 1932 г. трэба адрамантаваць два элеватары і ўстанавіць каля 10 лябёдак. Што мы маем на сёньняшні дзень? Элеватары працуюць у дзьве зьмены і то з перабоямі. З 9 лесьдь-лесьдь здабытых лябёдак, ні адна яшчэ не працуе, затое ўведзены ў работу ўжо 30 коняй.

Аб розьніцы ў коштце мэханізаванай выкаткі і выкаткі коньмі гавораць лічбы: выкатка аднаго кубамэтру бярвеньняў рабочай сілай каштуе **70 кап.,** а выкатка аднаго-ж кубамэтру коньмі абыходзіцца ў **1 руб. 15 кап. плюс кошт аўса і сена для коняй.**

Такім чынам, **выкатка коньмі каштуе амаль у два разы больш.** Лічбы яркa паказваюць эканомію ад мэханізаванай выкаткі.

Кіраўніцтва базы прызвычаілася гадамі да выкаткі коньмі і зараз марна траціць буйныя сродкі.

Нельга прамаўчаць яшчэ аднаго моманту, зьвязанага з выкаткай. Зараз каціць лес на бераг перашкаджае малая вада. Тэхнік узяўся быў за пракопку берагу, але не даважыўся давесьці справу да канца. Пакуль тэхнічны і будаўнічы аддзелы шукаюць, дзе знайсьці выхад, работа стаіць на месцы.

**Я. Арэшка.**

# АБУРАЮЧЫ ФАКТ

## (Ліст пісьменьніка)

7 верасьня г. г. старшыня калгасу «Новае Міхайлава», Новасёлкаўскага сельсавету (Пухавіцкі раён), Іван Варывончык зьявіўся ля сядзібы майго бацькі (калгасьніка калгасу «Новая Зара», Блоньскага сельсавету).

Адчуваючы цяжар і няўстойлівасьць у нагах ад выпітай гарэлкі, Варывончык сьпярша быў настроены вельмі мірна.

Ён залез у прысядзібны садок і пачаў трасьці яблыню. Стары бацька, які толькі гэтымі днямі ачуняў ад хваробы, заўважыўшы незнаёмага чалавека, накіраваўся да яго.

— Прышоў па яблыкі — досыць мірна паведаміў пра свае намеры Варывончык. Так сказаць, у госьці.

— Госьць, то госьцем, але-ж я ня ведаю, хто вы і адкуль?

Старшыня ледзь устаяў на нагах ад першага прыступу абурэньня. — Як, мяне вы ведаеце? Го-го! Я-ж старшыня калгасу «Новае Міхайлава». Зараз ведаеце? Частуй!

Бацька даў яму яблыкаў і яны разам пайшлі пад хату. Але праз які час Варывончык зноў зьявіўся ў садок.

Трасучы яблыкі, ён пачаў шпурляць імі на дарогу, дзе стаяў яго сябра рахункавод камбінату, такі-ж п'яны, як і Варывончык.

Калі Варывончыку заўважылі на самаўпраўства, ён абурыўся:

— Чаму я ня маю права тут распараджацца. Я-ж старшыня, а ён радавы калгасьнік! Калі вы пярэчыце, дык ладна-ж!

Разьюшаны, ён, размахваючы кулакамі, накіраваўся да хаты, дзе была мая жонка з малымі дзецьмі. Баючыся, каб ня былі напалоханы малыя, матка і жонка ня пусьцілі яго ў хату. Тады Варывончык з усёй сілы ўдарыў матку ў грудзі і палез праз парог.

У сьлепой злосьці ён падабраў пад ногі двухгадовае дзіцё, і трасучы кулакамі, пачаў лаяцца самымі брудными словамі.

— Я вам пакажу, як супраціўляцца! Што захачу, тое і зраблю. Я выганю вас з калгасу! Будзеце мяне памятаць. Потым пайшоў біцца да маёй жонкі.

На енкі і шум прыбег аднаасобнік Рудакоўскі.

— І ты прыбег! — наваліўся на яго грозны Варывончык. — Пачакай, вось я абрэжам пад калгасную зямлю, выганім з твaёй хаты, пазглядзеш як заступацца. Усіх параскулачваю.

Так было, пакуль не сьцямнела. Ня спыняючы пагроз і лаянкі, Варывончык выбраўся з хаты. Пасьля яго ўходу жонка ледзь выратавала прыдушанае ім дзіцё.

Гэта ня першы налёт і пагрозы з боку Варывончыка, які рэдка калі бывае цьвярозым. Зусім нядаўна ён зьбіў кулаком аднаго калгасьніка і уходзячы паабяцаў прысьці, каб не пакінуць камня на камені.

Бацька мой — серадняк. Да ўступленьня ў калгас плаціў 29 руб. падатку. У гэтым годзе, ня гледзячы на старасьць і частыя прыступы хваробы ,выпрацоўвае больш за паўтары сотні працадзён.

І, зараз, напалоханы самаўпраўствам Варывончыка, ня ведае, што рабіць, як абараніцца ад новых п'яных налётаў.

**М. Пасьлядовіч.**

**Ад рэдакцыі:** «Зьвязда» чакае ад Пухавіцкай РайКК-РСІ тэрміновага адказу на гэты ліст.

# Менбуд зрывае вучобу па дзесяці навучальных установах

*(Ліст працаўнік ў Будінстытуту)*

ЦК КП(б)Б і Саўнарком БССР абавязалі Менбуд скончыць будаўніцтва палітэхнікуму не пазьней **1 кастрычніка,** каб не сарваць навучальны год па 10 навучальных установах. Менбуд упарта ты выконвае пастановы партыі і ўраду.

Будоўля пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Вядома, што гаспадарчы разрахунак добрая справа, але нельга пакідаць будоўлі бяз усякага забесьпячэньня матар'ялам.

Агенгаў для рэалізацыі нарадаў па будматар'ялы няма. Нарады месяцамі валяюцца нерэалізаванымі. Прараб Гэрман, які пісе адказнасьць за будоўлю і ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку, заяўляе: «У мяне няма каму рэалізаваць нарады. Я рэалізую нарады толькі ў радыўсе 5 клм. ад будоўлі».

Яму вядома, што ваны каля Менску няма і каб атрымаць не абходна ехаць у Віцебск, або іншае месца. Але што да гэтага Герману. Ён пастаўлен у «гэткія ўмовы».

Грошы Менбуд атрымлівае сваячасова. Кіраўнікі Менбуду зацікаўлены атрымаць грошы, але выканаць абавязкі лічаць непатрэбным. 19 жніўня быў зьмешчан артыкул у «Зьвязьдзе», які сыгналізаваў аб небясьпецы зрыву будаўніцтва, аб адносінах Менбуду да гэтага будаўніцтва, але справа засталася бяз руху.

Навучальны год, які пачынаецца з 1-га кастрычніка, па дзесяці навучальных установах будзе сарваны. Адказнасьць за зрыў нясе Менбуд, які ігнарує пастановы партыі й ўраду аб скончэньні будоўлі да 1 кастрычніка.

Мы патрабуем зараз-жа ўмяшацца ў гэту справу ЦКК КП(б)Б і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых.

**Група працаўнікоў Будінстытуту па падрыхтоўцы кадраў.**

## Патрэбна палепшыць рабочае забесьпячэньне

*(Ліст рабочага)*

У **Асіповіцкім раёне** на складзе Уборкі сапсавалася паўвагона круп, якія паводле загаду **Зайцава** былі раздаены рабочым у паёк адразу на два месяцы.

Разьмеркаваньне мукі ў РЛК робіцца няправільна: адзін вучастак атрымлівае **2,5 тоны,** а другі з аднолькавай колькасьцю людзей атрымлівае **9 тон.**

Сталоўка працуе дрэнна. Страву гатуюць нясмачную, посную. У сталоўцы брудна, хлеба няма і г. д.

Нарады на атрыманьне прадуктаў ляжаць у праўленьні РЛК па два месяцы. Праўленьне лічыць, што снабжаць прадуктамі рабочых, якія працуюць на лесазагатоўках — не яго справа. Такія нядбайныя адносіны да грамадзкага харчаваньня дрэнна адбіваюцца на выкананьні пляну лесазагатовак.

**Н. А.**

## Скарыстоўваюць на чорнай рабоце

**Ліст студэнтаў-практыкантаў Будінстытуту).**

Мы, 7 чалавек студэнтаў практыкантаў працуем на пабудове трубаліцейнага заводу ў Магілеве.

Нас на працягу 1½ месяца выкарыстоўваюць выключна на падносы матар'ялу, што не дае практычных навыкаў аўладаньня кваліфікаванымі відамі працы.

Але і гэта было-б паўбяды. Нам гаворыць: «рабочых мала для падноскі» Мы згодны і працуем. Але навошта нас ашукваць?

За аднолькавую работу рабочыя атрымліваюць 7 руб., а мы 2 р. 19 кап. Прараб пабудовы т. Бебельнікаў матывуе: «мы нацягваем усялякімі камбінацыямі рабочым, а вы сьвідомыя, і так можаце папрацаваць».

Ніхто з тэхпэрсаналу не дапамагаў нам у асваеньні работ. Нават гутарак на гэтую тэму з намі не хацелі весьці.

Белмбіт павінен умяшацца ў гэту справу.

Група студэнтаў —

**Гапансвіч, Талер, Вашчылаў.**

Тэклін

# Прамысловасьць Віцебску павінна ліквідаваць прарыў

Лёгкая прамысловасьць БССР павінна даць краіне прадметаў шырокага спажываньня на 362 млн. руб. З гэтай сумы на 135 млн. рублёў прадметаў шырокага спажываньня павінны даць прадпрыемствы Віцебску. Вразумела, што прарыў у прамысловасьці Віцебску на сутнасьці зьяўляецца прарывам усёй лёгкай прамысловасьці.

Здавалася-б, што кіраўнікі прадпрыемстваў павінны былі ўлічыць леташнія памылкі, якія былі адзначаны ў пастанове аб'яднанага пасяджэньня ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад чэрвеня «Аб стане і рабоце віцебскай партарганізацыі». Між тым, важнейшыя ўказаньні да гэтага часу не ажыцьцёўлены. Прадпрыемствы Віцебшчыны з кварталу ў квартал ня выходзяць з бяздоньня прарыву. І калі для прарыву першага кварталу 1932 году былі некаторыя перабоі ў падачы электраэнэргіі Белдрэсам, дык у другім і трэцім квартале гэтых перабоеў не існавала. Наадварот, былі ўсе магчымасьці для поўнага выкананьня пляну.

Аднак, за другі квартал праграма выкананa ўсяго на 92,5 проц., за чэрвень — на 79,9 проц., за жнівень — 87,8 проц.

Чым тлумачацца гэтыя вялізарнейшыя прарывы? Адсутнасьцю цьвёрдага, канкрэтнага кіраўніцтва з боку многіх заводзкіх трыкутнікаў, апартуністычнай стаўкай на самацёк у справе ўліку работы. На пічотачным камбінаце, швэйнай фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», гарбарні складаюцца паказальнікі выкананьня пляну для самых прадпрыемстваў значна паніжаныя, а для гарадзкіх арганізацый павышаныя. З гарфармацыі фабрычных газэт рабочыя даведваюцца аб прарывах на прадпрыемстве, а паводле вестак раённай газэты на тым-жа прадпрыемстве пляны перавыкананы. Падобныя факты «очковтирательства», замазваньня сапраўднага становішча дэмабілізуюць рабочых, нараджаюць недавер'е да фабрычных вестак.

На трыкатажнай фабрыцы імя Клары Цэткін афіцыйнае выкананьне пляну лічыцца на здымцы з машын, а не з апошняга працэсу. Па сутнасьці-ж закончаным паўфабрыкат лічыцца толькі пасьля таго, калі ён праходзіць швэйна-кацельны цэх, калі перадаецца фабрыцы «КІМ» для аддзелкі. Няправільны ўлік паказальнікаў пляну прывёў да таго, што на 1 студзеня 1932 году на фабрыцы засталося паўфабрыкатаў на суму 405 тыс. руб., замест 100 тыс. паводле пляну. Такім чынам 75 тыс. пар панчох на суму ў 300 тыс. рублёў, залічаныя ў выкананьне пляну, фактычна засталіся ляжаць на прадпрыемстве бяз руху.

Матальны цэх фабрыкі дабіўся эканоміі на даламожных матар'ялах за паўтодзьдзе ў 18.444 руб. Між тым прэмія цэху да гэтага часу ня выплачана.

Вязальны цэх гэтай-жа фабрыкі ў выніку нагардлівых адносін да гаспадарчага разрахунку мае страт на 66.213 руб. Між тым, цэху адпускаецца сырэц, дапаможныя матар'ялы, зарплата, ня ўлічваючы стаўку кантакарэнту. Страты ўсё ўзрастаюць. Так на першае жніўня па фабрыцы яны дасягнулі 76.785 рублёў.

Ні адзін дырэктар прадпрыемства не скарыстаў цэхавага гаспадарчага разрахунку для барацьбы з бескгаспадарчасьцю і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў з тым, каб палепшыць работу цэхаў. Работа не кантралюецца рублём.

На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» дзеяздольнай прадукцыі перавысілі установлены леміт у 2-3 разы. Але на гледзячы на гэта, закройны цэх адпускае цэхам паўфабрыкат.

Як правіла, ні на адным прадпрыемстве ў канцы месяца не складаецца канкурэнтурны агляд выкананьня нарада-заказаў, па цэхах не абмяркоўваюцца вынікі дзейнасьці гаспадарчага разрахунку. Гэта прывяло да таго, што фабрыка імя Клары Цэткін на 1 ліпеня мела страт на 77.591 руб., на 1 жніўня страты ўзрасьлі да 93.561 руб. Фабрыка «Прафінтэрн» за чэрвень і ліпень мае страт на 38.833 руб.

Мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, гаспадарчыя аб'яднаньні амаль не займаліся пытаньнем свячасовага выпраўленьня эфэктыўнасьці працы цэхаў на гаспадарчым разрахунку.

ЦК і ЦКК КП(б)Б яшчэ ў мінулым годзе ў сваіх пастановах падкрэсьлілі, што «цэнтральнай задачай у рабоце віцебскай партарганізацыі зьяўляецца ўмацаваньне кіраўніцтва сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам». Сапраўды ў сакавіку і красавіку бягучага году на прадпрыемствах Віцебску спаборніцтва было разгорнута. Быў арганізаван конкурс на лепшае прадпрыемства. Пачалася барацьба за пераходны сьцяг.

Гарком партыі, гарпрафсавет сачылі за дзейнасьцю прадпрыемстваў. Крывая выкананьня пляну пайшла ўверх. У сакавіку плян выкананы на 102 проц. Характэрным у выкананьні пляну зьяўляецца красавік. У першай дэкадзе плян выкананы на 91,5 проц., у другой на 89,8 проц. і ў трэцяй на 100,5 проц. Мясцовыя арганізацыі, выявіўшы зьніжэньне выкананьня пляну ў пачатку красавіка, шырока разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва і крывая рэзка пайшла ўверх.

У маі ня былі замацаваны посьпехі, дасягнутыя ў сакавіку і красавіку, і крывая зноў ідзе ўніз. Першая дэкада дала выкананьне на 95,2 проц., другая — 92 проц., трэцяя — 89,2, а ў ліпені праграма выкананa ўсяго на 79,9 проц. Гаспадарча - разрахунковымі брыгадамі ніхто ня цікавіўся. Запушчан улік работы. На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» да гэтага часу не вялі ўліку ўдарніцтва. І толькі зараз пачынаецца вярбоўка ўдарнікаў, арганізацыя брыгад і падрыхтоўка іх да пераводу на гаспадарчы разрахунак. На гэтай фабрыцы ёсьць яшчэ цэхі, якія ня маюць ні аднэй гаспадарча-разрахунковай брыгады толькі таму, што не падрыхтавалі дагавароў, не распрацавалі заданьняў.

На фабрыцы імя Лекерта дагаворы падрыхтаваны, але яны да сёньняшняга дня не падпісаны. Брыгадам выплачваецца прэмія за эканомію, якой у сапраўднасьці няма.

Лепшыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады на фабрыцы імя Клары Цэткін распаліся з-за адсутнасьці выхаваўчай работы з ударнікамі. На пічотачным камбінаце ў афіцыйных справаздачах лічыцца 40 гаспадарча-разрахунковых брыгад, а пры праверцы выявілася, што іх толькі 30. Безадказныя адносіны да вышэйшых форм сацыяборніцтва з боку гарпрафсавету і фабрычна-заводзкіх арганізацый прывялі да аслаблення барацьбы за плян

Расьце цякучасьць рабочай сілы. На фабрыцы імя Клары Цэткін за другі квартал прынята 328 рабочых, а пакінулі прадпрыемства 424. У ліпені прынята 32 рабочых, а адышло 194. Толькі за першую дэкаду жніўня пакінула фабрыку 32 рабочых. Пры такім становішчы важнейшы цэх фабрыкі ўкамплектаван рабочай сілай на 65-68 проц. Адсюль выкананьне праграмы са дня ў дзень зьмяншаецца — 56 проц., 53 проц., 44 проц., 43 проц. і 2-га верасьня яна выкананa ўсяго па 38 проц.

Аслабла працэсыцыпліна. Прагулы па паўважлівых прычынах на «Чырвоным мэталісьце» даходзяць да 65 проц. Ня лепш і на іншых прадпрыемствах

Якасьць прадукцыі знаходзіцца на нізкім узроўні. На швэйнай, трыкатажнай і абутковай фабрыках дрэнная прадукцыя выяўляецца нават пасьля фабрычнага бракеражу. Не вядзецца барацьба з бракам. Кошт страт за брак не спагняецца. Гэта было адзначана ў мінулым годзе, гэта застаецца і на сёньняшні дзень.

Важнейшая задача, жая стаіць у даны момант — арганізацыя рабочага снабжэньня. Ва ўмовах Віцебшчыны яна яшчэ ня стала ў цэнтры ўвагі. Сяўба важнейшае мерапрыемства ў арганізацыі рабочага забесьпячэньня ў каалярацыйных гаспадарках Віцебску дрэнна праведзена і цізкай якасьці. Яшчэ горш праведзена пранолка. У выніку прыгарадныя гаспадаркі ня могуць лічыцца харчовай базай прадпрыемстваў.

Асаблівай увагі заслугоўвае дрэнная работа многіх фабрычных сталовых. Кошт абедаў з мая ўзрос у 2-3 разы. Няма цьвёрдых цэн, яны вызначаюцца кожны дзень. Запасаў прадуктаў харчаваньня сталовыя часта ня маюць. Прыгатаўленьне абедаў залежыць ад загатоўленых прадуктаў у той-жа дзень. Прадукты загатаўляюцца на прыватным рынку па павышаных цэнах, што, зразумела, адбіваецца на калькуляцыі абедаў. Ня зьмянчаны чаргі. Рабочаму прыходзіцца стаяць кожны дзень па 10-15 хвілін для таго, каб купіць талён на абед. Кожны стараецца раней стаць у чаргу. Таму часта кідаюць работу да гудка.

Барацьба за танны абед партарганізацыямі прадпрыемстваў не вядзецца. Замест таго, каб змагацца за зьніжэньне нажладных выдаткаў, яны пайшлі на шляху найменшага супраціўленьня. Вынесены пастановы адпускаць абеды не даражэй 40-70 кап. (парткалектыў фабрыкі імя Клары Цэткін, «Сьцяг індустрыялізацыі»), а абеды каштуюць ад 90 да 1 руб. 20 кап. Розьніцу пакрывае адміністрацыя фабрыкі. На такое «патаканьне» абедаў выдаткаваны тысячы руб.

Харттрэст не зьяўляецца гаспадаром сталовых і гаспадарчай дзейнасьцю іх ня кіруе. Ён ня ў стане забясьпечыць сталовыя патрэбнай колькасьцю гародніны нават у летні час.

Работа памочнікаў дырэктара па рабочым забесьпячэньні на прадпрыемствах скажаецца. Замест дапамогі ЗРК у рабоце, правільнага плянаваньня, работы над узмацненьнем харчовай базы, яны пераўтварыліся ў старшых агентаў па снабжэньні сталовых прадуктамі харчаваньня. Нам. дырэктары па рабочым забесьпячэньні пасылаюцца ў калгасы для закупкі гародніны, жывёлы, сьвіней, трусоў і г. д. (фабрыка «Прафінтэрн». імя Лекерта).

Да харчовых канфэрэнцый ЗРК і арганізацыі Віцебску зусім не падрыхтаваліся. На фабрыках імя Лекерта, «Прафінтэрн» і пічотачным камбінаце няма пляноў спажэньня рабочых. А тыя пляны, якія ёсьць, неканкрэтныя, не разьбітыя па месяцах і кварталах. Пры такім плянаваньні фабрычна-заводзкія арганізацыі пазбаўлены магчымасьці сачыць за ходам загатовак. Зусім не забясьпечана фінансаваньне загатовак. Пляны разьлічаны на сотні тыс. рублёў, а хто дасьць на гэта сродкі — у ЗРК ня ведаюць.

Важнейшая пастанова ЦК КП(б)Б аб рабочым забесьпячэньні і правядзеньні харчовых канфэрэнцый ня выканана. Гарпрафсавет гэтай справай не займаўся. Віцебскі гарком КП(б)Б абмежаваўся вынясьненьнем сваёй пастановы, але кантролю выкананьня ні гарком, ні гарКК не паладзілі.

Партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі на прадпрыемствах ня поўнасьцю перабудавалі сваю работу ў аднаведнасьці з гістарычнымі ўказаньнямі правады ра партыі тав. Сталіна. Праца ў большасьці выпадкаў праводзіцца старымі мэтадамі.

Для выкананьня пляну на прадпрыемствах Віцебску ёсьць усе магчымасьці. Патрэбны бальшавіцкія мэтады работы. Рэальнасьць пляну пацьвярджаюць наступныя паказальнікі: калі з 16 прадпрыемстваў, узятых гарсаветам для нагляду ў першай і другой дэкадзе жніўня, плян выканалі толькі 3 прадпрыемствы, дык пры разгортваньні масавай работы ў 3-яй дэкадзе плян перавыканан 6 прадпрыемствамі.

Гэта дае поўную падставу патрабаваць ад усёй віцебскай партарганізацыі разгортваньня масавай **работы па мабілізацыі** мас на поўнае выкананьне пляну 4-га заключнага.

Віцебскія партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны выправіць скрыўленьні ў пытаньнях плянаваньня, укараненьня гаспадарчага разрахунку, палепшэньня рабочага снабжэньня. Тады выкананьне прамфінпляну бязумоўна будзе забясьпечана.

# РОСПУСК ГЕРМАНСКАГА РЭЙХСТАГУ

Падзеі апошніх дзён у Германіі маюць вялізарнае палітычнае значэньне. Большасьць, якая ня мае роўнай у гісторыі парлямэнтарызму, рэйхстаг 12 верасьня выказаў недавер'е ўраду фон-Папэна, ухваліў пастанову аб скасаваньні апошняга надзвычайнага дэкрэту і адмовіўся падпарадкавацца дэкрэту прэзыдэнта і ўраду аб сваім роспуску.

Урад распусьціў рэйхстаг. Урад, зразумела, і не падумаў падпарадкавацца пастанове рэйхстагу і падацца ў адстаўку.

Ясна, што **падзеі 12 верасьня ў рэйхстагу выкрылі крайняе абвастрэньне супярэчнасьцяй унутры германскай буржуазіі**, паскараюць набліжэньне рэвалюцыйнага крызісу.

Чым выкліканы гэтыя падзеі? Фашысцкая дыктатура, якая ажыцьцяўлецца ўрадам фон-Папэна-Шлейхера, усталявалася ва ўмовах, калі адносная стабілізацыя капіталізму пад ударамі крызісу скончылася, калі шпарка нарастае ўздым рэвалюцыйных мас. Для выратаваньня нямецкай гаспадаркі ад катастрофы, для барацьбы супроць узрастаючага абурэньня шырокіх мас і набліжэньня рэвалюцыйнага крызісу ўрад фон-Папэна выдаў надзвычайны дэкрэт, які вызваляе буйную буржуазію ад значнай часткі падаткаў і прачануе ёй субсыдыю за кожнага пова-прынятага рабочага пры скарачэньні зарплаты для ўсіх рабочых ніжэй тарыфных дагавораў. Урад Папэна пастанавіў папрабаваць аслабіць рэвалюцыйны рух шляхам пацкоўваньня беспрацоўных на працуючых рабочых, каб такім чынам яшчэ больш зьнізіць жыцьцёвы ўзровень усёй рабочай клясы. Гэты план пад націскам рэвалюцыйнага руху ўрад фон-Папэна выдае за план ажыцьцяўленьня гаспадаркі.

У той-жа час, рэвалюцыйны ўздым бязупынна нарастае. Ліпеньскія выбары паказалі значнае павялічэньне ўплыву камуністаў і зьмяншэньне галасоў, паданых за сацыял-дэмакратыю.

Пасьля выбараў бражэньне ў шырокіх масах працоўных узмацнецца з дня ў дзень. Рабочая кляса ўсё больш пачынае ўсьведамляць гібельнасьць сацыял-дэмакратычнай палітыкі «меншага зла» і падпарадкаваньня надзвычайным дэкрэтам. Расьце незадавальненьне шырокіх мас дробнай буржуазіі, служачых і сялянства, якім урадавыя мерапрыемствы нічога не далі і даць ня могуць. Барацьба камуністычнай партыі супроць ураду фон-Папэна і яго надзвычайнага дэкрэту падымае на ногі ўсё больш шырокія масы працоўных. Усё больш выяўляецца крах дробна-буржуазных творый у рабочых масах.

Сацыяльнай і нацыянальнай дэмагогіяй на цьмянал-сацыялістам удалося пацягнуць за сабой шырокія масы дробнай буржуазіі, служачых і некаторую частку рабочых. Буржуазія падтрымлівае фашысцкі рух, як баявую армію для разгрома рэвалюцыйнага руху і як зброю ўстанаўленьня фашысцкай дыктатуры.

Але ўзрастаючая нагроза гаспадарчай катастрофы і рост рэвалюцыйнага ўздыму, які ўносіць бражэньне ў рады нацыянал-сацыялістаў, аслабляюць гэтую партыю і прымушаюць фінансава-трэстаўскую алігархію марудзіць з перадачай нацыянал-сацыялістам апарату ўлады. Побач з гэтым ліквідуюцца групы фінансавай алігархіі, якія канкуруюць з тымі, што стаяць на чале ўлады, імкнуцца скарыстаць партыю нацыянал-сацыялістаў у блёку з каталіцкім цэнтрам для сьвяржэньня ўраду Папэна і замены яго іншым фашысцкім урадам.

Становіцца ўсё больш ясным, што крызіс ужо такія супярэчнасьці ў лягер германскай буржуазіі, якія робяць умацаваньне фашысцкай дыктатуры ў Германіі ўсё больш цяжкім. Германская буржуазія парабыла скарыстаць у першую чаргу чыста буржуазныя па сваім складзе арганізацыі («Сталёвы шлем» і інш.). Буржуазія пастанавіла ажыцьцяўляць фашысцкую дыктатуру не адразу, а ў выглядзе бязупыннага паступленьня на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас, шляхам прывучэньня рабочых да пастаяннага, бесперапыннага тэрору з боку арганізацый і груп, фармальна яшчэ ня ўключаных у дзяржаўны апарат, але якія на справе зьяўляюцца апорай дзяржаўнай улады. Кіруючая фашысцкая група разьлічвала гэтым шляхам умацаваць сваю дыктатуру, ня прыцягваючы адкрыта да ўлады масавыя фашысцкія арганізацыі. Пры гэтым нацыянал-сацыялісты зьяўляюцца баявой сілай ўраду буйнага капіталу ў справе расправы з рабочай клясай.

**Адкрытая барацьба ўнутрыгерманскай буржуазіі ўсё больш абвастрае становішча ў краіне, робіць гэта становішча усё менш устойлівым, аслабляе буржуазію і паскарае набліжэньне рэвалюцыйнага крызісу.** Усё больш ясным становіцца, што ў Германіі ў найўнасьці развал народнай гаспадаркі, абвастрэньне супярэчнасьцяй, рост сіл камунізму. Усё больш ясным становіцца, што **рост фашызму зусім не зьяўляецца вынікам умацаваньня капіталізму ў Германіі, а ў першую чаргу паказальнікам яго паслабленьня, крызісу.** Усё больш ясным становіцца, што, ня гледзячы на рост контр-рэвалюцыі, і у прыватнасьці, фашысцкіх масавых арганізацый, **пралетарыят унутры Германіі ўсё больш згуртоўваецца ў адзіным фронце пад кіраўніцтвам кампартыі.**

Няма сумненьня, што цяперашні ўрадавы крызіс, чым бы ён ни скончыўся, яшчэ больш разбудзіць да палітычнай актыўнасьці новыя, яшчэ больш шырокія масы, чым крызіс 1 чэрвеня і 20 ліпеня, расьсейваючы парляманцкія ілюзіі, веру ў тое, што выбарчым бюлетэнем і парляманцкім галасаваньнем можна зьмяніць дзяржаўны лад у Германіі. На гэтых гістарычных падзеях масы навучаюцца тай ісьціне, што выратаньне палітычнага лёсу Германіі ўжо перанесена на вуліцу і будзе разгортвацца па вуліцы шляхам сутычак клясавых сіл. Фашысцкі ўрад фон-Папэна-Шлейхера, ня маючы магчымасьці чым-небудзь задаволіць працоўныя масы, хоча накіраваць іх незадавальненьне па шляхі замежнага становішча Германіі, выступаючы за перагляд Вэрсальскага дагавору.

Але гэтым ён ня можа аслабіць вострасьці клясавай барацьбы ўнутры краіны. Рэвалюцыйны крызіс у Германіі набліжаецца. Германская кампартыя вучыцца па падзеях мінулага, каб яшчэ з большай энэргіяй мабілізаваць масы для рашаючых клясавых бояў. Забастовачны рух расьце, на прадпрыемствах адбываецца барацьба супроць правядзеньня надзвычайнага дэкрэту фон-Папэна. Расьце рух беспрацоўных. Расьце адпор фашысцкім праваканцыям на вуліцы.

Германская кампартыя імкнецца да аб'яднаньня рабочае клясы для рашучага адпору наступленьню фашызму і рэакцыі шляхам масавай палітычнай забастоўкі, яна мабілізуе ўсе сілы для барацьбы супроць ілжывай дэмагогіі сацыял-дэмакратыі, для барацьбы за ўладу, за дыктатуру пралетарыяту, якая вызваліць германскія працоўныя масы з крызісу, галечы і голаду.

Пытаньне аб барацьбе за дыктатуру пралетарыяту Германіі становіцца ўсё больш у парадак дня. Для гэтай барацьбы шырокія масы працоўных аб'яднаюцца ў алізіны фронт пад кіраўніцтвам кампартыі. (Скарочаная перадавая «Правды», пераданая па радыё).

## 19-я АРМІЯ АДМОВІЛАСЯ ВАЯВАЦЬ СУПРОЦЬ КІТАЙСКІХ САВЕТАЎ

**НЮ-ЕРК, 10. 19 кітайская армія, якая адзначылася сваёй абаронай Шанхаю, прымушана была спыніць кампанію супроць кітайскіх савецкіх войск у раёне правінцыі Фуцзян з прычыны АДМОВЫ САЛДАТ ВЫСТУПАЦЬ НА АБАРОНУ ІНТАРЭСАЎ КАПІТАЛІСТАЎ І ПАМЕЩЫКАЎ. 700 паўстаўшых салдат было расстраляна і 8.000 абязброена.**

## Чан Кай-шы стварае „фашысцкую партыю"

ШАНХАЙ, 10. У кітайскіх палітычных колах узмоцнена цыркулююць чуткі аб **стварэньні ўнутры Гаміндана новай, так званай «фашысцкай» партыі на чале з Чан Кай-шы.**

Газэта «Кантон Дэйлі Сэн» зьмяшчае наступны план стварэньня гэтай партыі. Так званая «фашысцкая» партыя будзе складацца з 3.000 членаў, з якіх—2.000 кадэтаў з акадэміі ў Вампу. Акрамя таго, будзе створан спэцыяльны «корпус разумовай культуры» для падрыхтоўкі работнікаў па ўкараненьні прынцыпаў фашызму ў новую армію. Будзе створана «брацтва жалеза і крыві» ў складзе 25 чал. Галоўная задача брацтва—**«забойства палітычных і ваенных праціўнікаў новай партыі».**

Сродкі партыі складаюцца з асабістага ўзносу Чан Кай-шы ў суме 1.200 тыс. даляраў і членскіх узносаў.

Аб палітычнай праграме новай «фашысцкай» партыі ў кітайскіх газэтах пima амаль ніякіх указаньняў. Некаторыя ўказаньні аб палітычнай праграме кітайскіх фашыстаў можна знайсьці толькі ў паведамленьні спэцыяльнага карэспандэнта японскай газэты **«Осака Майніцы»** ў Шанхаі. Карэспандэнт піша: што **«фашысты прызнаюць цяперашняе становішча Манчжурыі і пазыцыю Японіі ў Манчжурыі. У абмен за гэта Японія павінна дапамагчы ім аб'яднаць Кітай пад сьцягам фашызму».**

(ТАСС).

## Прыгавар над Гаргулавым выканаў

**ПАРЫЖ, 14. Агенцтва «Гавас» паведамляе: «Гаргулаў пакараны сьмерцю ў 5 гадз. 52 мін.».**

## Пратэст францускага генэральнага консула ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 13. Як падае газэта **«Чайна прэс»**, францускі генэральны консул у Шанхаі ўжо два разы пратэставаў перад японскім консульствам супроць налёту японскіх паліцэйскіх у штацкім на францускую канцэсію з мэтай арышту аднаго са старэйшых рэзыдэнтаў. Францускі консул зазначыў магчымасьць ускладненьня ў выпадку невыкананьня японскімі ўладамі неабходных фармальнасьцяй.

## Забастоўка галяндзкіх маракоў пашыраецца

БЭРЛІН, 12. Забастоўка галяндзкіх маракоў **пашыраецца.** Бастуе ўжо **звыш 10 тыс. маракоў.** У забастоўку ўцягваюцца каманды амаль усіх суднаў, якія ўваходзяць у галяндзкія гавані. **У Ротэрдаме** адбыўся сход германскіх, трэцкіх і галяндзкіх маракоў, на якім выбран камітэт салідарнасьці.

# *Да юбілею 40-гадовай літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага*

Надыход юбілею аднаго з выдатнейшых і ўлюбёных пісьменьнікаў ня толькі Савецкага саюзу, але і ўсяго сьвету — **Максіма Горкага** выклікаў сярод пралетарскай грамадзкасьці і арганізацый БССР вялікую хвалю падрыхтоўкі да ўшанаваньня юбіляра.

Падрыхтоўка да юбілею шырока разгортваецца па ўсім Савецкім саюзе і будзе правядзіцца пад знакам шырокай папуляризацыі сярод працоўных мас творчасьці М. Горкага.

Наркамасьветы БССР і аргкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі намецілі правядзеньне ва ўсіх гарадох, раённых цэнтрах, на фабрыках і заводах, у саўгасах, калгасах, бібліятэках, школах і клюбах літаратурна-мастацкіх вечароў, спэцыяльных дакладаў лекцый аб літаратурна-мастацкай і грамадзкай дзейнасьці М. Горкага. Таксама будуць наладжаны спэцыяльныя выстаўкі, якія будуць характарызаваць увесь творчы шлях пісьменьніка.

Лепшым клюбам, бібліятэкам і школам будзе надана імя Горкага. За найлепшыя літаратурна-мастацкія творы вызначаецца штогодная прэмія імя Горкага, а ў ВНУ—стыпэндыя. У тэатрах і кіно будуць ставіцца і дэманстравацца творы Горкага. Літаратурныя гурткі праводзяць цыкль заняткаў аб значэньні М. Горкага як у літаратуры Савецкага саюзу, так і ў сусьветнай літаратуры.

У газэтах, часопісях, спэцыяльных брашурах будзе шырока папулярызавацца літаратурная дзейнасьць юбіляра.

ДВВ выдае рад твораў Горкага на беларускай мове. Брыгада навуковых работнікаў БАН, якая працуе над творчым мэтадам пралетарскай літаратуры, падрыхтуе рад дакладаў аб творчым мэтадзе М. Горкага і зробіць іх як у самой акадэміі, а таксама на прадпрыемствах Менску і пэрыфэрыі.

Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут імя Леніна рыхтуюць выстаўку ўсіх твораў пісьменьніка і крытыкі пра яго, у часе якой будзе чытацца лекцыя на тэму: жыцьцё і творчасьць Горкага, а таксама будзе праводзіцца кансультацыя па пытаньнях яго творчасьці. Такія-ж выстаўкі будуць ва ўсіх іншых бібліятэках. Акрамя выстаўкі бібліятэка і бібліяграфічны інстытут прыняў удзел у складаньні зборніка аб М. Горкім і паслалі ў Маскву бібліяграфію перакладзеных на беларускую мову яго твораў.

Раённыя бібліятэкі дадаткова ўкамплектоўваюцца творамі Горкага.

* Максім Горкі напісаў сцэнары для мастацка-гукавога фільму пад назвай «Злачынцы». У гэтым сцэнары, які напісан па матар'ялах працкамуны ДПУ, М. Горкі па-новаму асьвятляе праблемы ліквідацыі бяспрытульнасьці. Фільм будзе ставіць рэжысэр А. Роом.

* 24 і 25 верасьня ва ўсіх кіно-тэатрах будуць дэманстравацца кіно-фільмы па творах М. Горкага. Адбудуцца ранішнікі для дзяцей.

* Саюзкіно да юбілею Горкага выпускае спэцыяльна зроблены гукавы кіно-фільм «Каін і Арцём».

* Маскоўскі электразавод да юбілею. М. Горкага выдае спэцыяльную брашуру на гісторыі заводу і спэцыяльны нумар заводзкай газэты.

Аднаму з цэхаў заводу, дзе ёсьць шмат рабочых аўтараў, надаецца назва «імя М. Горкага».

## Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

### Першыя 300 кілёграм савецкага фэравольфраму

ЧАЛЯБІНСК. 10 верасьня, у 1 гадзіне ночы, на заводзе фэрасплаваў ім. Варашылава пачалася першая пляўка фэравольфраму. Плаўка працягвалася каля 20 гадзін. Увечары атрыманы першыя 300 кілёграм савецкага фэравольфраму. Вынікі аналізу чакаюцца ў бліжайшыя дні.

### Сельгасмашыны

10 верасьня завод Гомсельмаш выпусьціў 18 сіласарэзак «Папэк» — 100 проц. заданьня; 5 сіласарэзак «Інтэрнацыянал» — 27,8 проц.; 17 сячкарань — 100 проц., 2 бульбамыйкі — 22,2 проц.; 9 бульбасартовак — 53 проц. і 4 канюшынасартоўкі — 100 проц. заданьня.

### Будматар'ялы

9 верасьня лесазавод імя Халтурына расьпілаваў 279,8 кубамэтраў лесаматар'ялаў, што складае 97,1 проц. пляну.

***

З 6 па 10 верасьня дортацынікоў завод «Чырвоны Кастрычнік» выпусьціў 21.600 кілёграм буданічных цьвікоў, што складае 79,4 проц. пляну.

### Шырспажыў

З 6 па 10 верасьня фабрыка імя 1-га мая выпусьціла па шырспажыву 480 каўняроў — 100 проц. заданьня, 68 жаночых пальтаў — 154,5 проц., 49 куртак — 122,5 проц. і 121 целагрэйку — 91 проц. пляну.

## З ЗАЛІ СУДА

# ЗЛАЧЫНЦАМ НЯМА ЛІТАСЬЦІ

Выязная сэсія раённага трыбуналу пагранаховы і войск АДПУ, 6-9 верасьня, у г. Барысаве, на адкрытым судовым пасяджэньні разглядала справу кіруючых работнікаў Барысаўскай міліцыі.

На лаве падсудных — былы начальнік міліцыі **Мінчын**, камісар 3-га ведамственага дывізіёну — **Усаў**, начальнік Н. Барысаўскага гарадзкога аддзяленьня міліцыі — **Міхневіч**, старшыня міліцыянэры — **Кузьняцоў і Калошын.**

Грубейшае парушэньне рэвалюцыйнай законнасьці, мазаньне прынцыпова-палітычных пытаньняў пры расьсьледаньні пекаторых спраў і рад іншых злачынных учынкаў — такая ў асноўных рысах «практыка» насаджанай на лаву падсудных пяцёркі.

Людзі, якім даверана адказная работа па ўмацаваньні рэвалюцыйнай законнасьці, самымі агідненьшымі прыёмамі парушалі асновы законаў савецкай улады, дыскрэдытавалі орган пралетарскай дыктатуры — міліцыю і гэтым самым лілі ваду на млын клясава-варожых элемэнтаў.

Цэнтральнай фігурай на прынасе-праходзіць былы начальнік міліцыі — **Мінчын.** Грубым вацкам пралетарскай самасвядомасьці, сьвядомым замазваньнем раду фактаў злачынай дзейнасьці пасобных міліцэйскіх работнікаў, сыстэматычным п'янствам і разбэшчанасьцю папоўніў сваю біяграфію Мінчын за 4-хмесячны тэрмін работы ў якасьці начальніка Барысаўскай міліцыі.

Судовы допыт пачынаецца з «героя» меншых маштабаў — **Кузьняцова.**

Нязграбна падымаецца высокая постаць, ён мнецца, ухіляецца ад простага адказу.

— Ці прызнаеце сябе вінаватым у беззаконным арышце і зьдзеках над дыректарам электрычнай станцыі тав. **Нанісам**, членам райКК.

Павольна, спакойным, чудным голасам Кузьняцоў расказвае: «Арыштавалі мы Наніса ноччу, западозрыўшы яго ў хуліганстве. Калі пасадзілі яго ў камэру, ён пачаў крычаць, будзіць, стукаць у дзьверы. Тады мы яго выпусьцілі, зьвязалі і пакінулі зьвязаным у калідоры».

Таксама спакойна дае паказаньні і непасрэдны дапаможнік Кузьняцова ў зьдзеках над Нанісам — Калошын.

Фактычна справа была інакш. Т. Наніс быў затрыманы на вуліцы без якіх-бы там ні было падстаў. Повадам для арышту паслужыла залва возчыка аб тым, што нібы хтосьці хацеў затрымаць возчыка і абрабаваць. Будучы дзяжурным у праўленьні міліцыі, Кузьняцоў выходзіць з свайго пасту, склікае па вуліцы міліцыянэраў і кідаюцца яны ў пошукі злачынцы. Спаткаўшы на дарозе Наніса, арыштавалі яго «за хуліганства і п'янства». Настойлівая просьба тав. Наніса выклікаць доктара, ці каго-небудзь з начальніцкага складу міліцыі, засталася бяз вынікаў. Кузьняцоў і Калошын сьвязалі яму рукі і ногі і кінулі ў калідор арыштнага памяшканьня. Пасьля таго, як Наніс праляжаў гадзіны 2-3 зьвязанымі, Кузьняцоў з Калошыным рашаюць ужыць да яго «амністыю» — разьвязаць. Тут Наніса разьвязваюць і кідаюць у камэру, дзе знаходзіліся рэцыдывісты і жулікі. Адчыняючы дзьверы камэры, Кузьняцоў кінуў рэпліку:

— Прымеце чырвонага дыротара...

Такі факт не адзінкавы. Беспадстаўныя арышты і галоўным чынам зьбіеньні ў камэрах, былі сыстэмай у арыштным памяшканьні. Калі зладзеі - рэцыдывісты пачыналі зьдзеквацца з арыштаванага, Кузьняцоў і іншыя спакойна назіралі праз «ваўчок» камэры. Кузьняцоў удаляе сабой тыпа, які здольны вязаць каго хочаце, колькі хочаце і пры якой хочаце ўладзе. Такія элемэнты маглі знаходзіцца ў радах міліцыі толькі таму, што само кіраўніцтва Барысаўскай міліцыі ў асобе Мінчына страціла клясавы твар.

Замест жорсткага рэагаваньня на злачынствы, Мінчын фабрыкуе матар'ялы, якія-б апраўдалі паводзіны Кузьняцова і Калошына, абвінавачвае ў хуліганстве Наніса і дасылае гэтыя матар'ялы ў Барысаўскую райКК.

Наступным дапытваецца былы начальнік Нова-Барысаўскага аддзяленьня міліцыі — Міхневіч. З дзіцячай наіўнасьцю ён прабуе давесьці, што абавязан быў дапамагаць камісару Усаву рабіць злачынствы.

Са службы ў міліцыі быў зволен без усякіх на тое падстаў камандзір аддзяленьня — Ганец. Праз некалькі дзён камісар Усаў спомніўся, што за Ганцом ліцыцца пара старой бялізны.

— Арыштаваць, прывесьці, пакараць! — аддаў загад Усаў. Ганца арыштоўваюць, дастаўляюць Усаву. Ганц настойліва патрабуе тлумачэньня прычын арышту, пратэстуючы супроць зьдзекаў. «Камісар» Усаў загадвае міліцыянэрам пасадзіць даставіцьвяроўкі і з дапамогай Міхневіча вяжа Ганца.

Усаў — гэта пізкая істота, прабуе штонебудзь «вымучыць» з сваёй галавы для зьмягчэньня ўражаньня аб учынках. Але даромна. Паказаньні сьведак, факты «дзейнасьці» Усава, устаноўленыя папярэднім судовым сьледствам, разгортваюць малюнак злачынстваў. Чалавек, які «камісарыў», які карыстаючыся назвай рабочага, пасіў нэртыйны білет у кішэні, нічога агульнага ня меў ні з рабочай клясай, ні тым больш з яе партыяй. Усаў — гэта вечны п'яніца, плут і кар'ерыст. Яго рэдка можна было сустрэць у параўнаўча цьвярозым выглядзе.

— Загадваю аддаць мне «честь» — гістэрычна выкрыкваў Усаў пры кожным спатканьні з міліцыянэрамі.

— Я табе прапішу правы ўхіл і справе дам ход на 103 арт.

Глядзячы на Усава здзіўляешся, як да панных часоў мог дажыць Шчэдрынскі Угрум-Бурчэеў, той самы гарадничы, з аргачыкам замест талавы, што ведаў толькі два словы — не папярыло і зрэйную.

Па справе зьдзекаў Усава і Міхневіча над Ганцам праводзіў сьледзтва памочнік начальніка міліцыі тав. Ласкін. Устанавіўшы злачынства, ён патрабаваў адданьня пад суд Усава і Міхневіча, але Мінчын гэты пратакол сьледзтва зьнішчыў.

Змазваньне фактаў злачынай дзейнасьці пасобных міліцэйскіх работнікаў было сыстэмай у практыцы начальніка міліцыі Мінчына. Напрыклад, былы вучастковы інспэктар Мільвіт атрымаў заданьне спагнаць штраф за самаўласную парубку лесу з грамадзян Бармсава — Крушіна Хаіма. Але Мільвіт чамусьці накіроўваецца ў вёску Максымаўку і патрабуе гэты штраф з гр. Крукава Аніхея. Даромныя былі доказы Крукава, што ён ня Крушін Хаім. Мільвіт з рэвальвэрам у руках доўга зьдзекаваўся з яго, а пасьля з сельскага выканаўцы Прадзеда.

Ведаючы аб гэтай справе, Мінчын літараль па нічога ня ўжыў для пакараньня Мільвіта. Толькі дзякуючы таму, што аб зьдзеках даведалася райКК, Мільвіт быў адданы пад суд і пасьля асуджан на 3 гады пазбаўленьня волі.

Гэтымі фактамі далёка ня вычэрпваецца злачынная дзейнасьць падсудных. Калі да гэтага дадаць факты салдафонскіх зьдзекаў Мінчына над падначаленымі міліцыянэрамі, яго пастаянныя пагрозы «пусьчу кроў», забаронаю міліцыянэрам хадзіць за якімі-бы там ні было парадамі да пракуратуры, дык перад вачыма паўстае поўны малюнак агідных бясчынстваў свавольства, якія рабіліся пасобнымі кіруючымі работнікамі Барысаўскай міліцыі на чале з Мінчыным.

Пралетарскі суд, пільна ахоўваючы рэвалюцыйную законнасьць, абезпілтасны як даяўных клясава-варожых элемэнтаў, так і даўніх дапаможнікаў — злачынцаў, парушыцеляў рэвалюцыйнай законнасьці.

Выязная сэсія ваеннага трыбуналу пагранаховы і войск АДПУ **ПРЫГАВАРЫЛА Мінчына да 8 год пазбаўленьня волі, Усава да 6 год з высылкай у далёкія мясцовасьці СССР, Міхневіча і Кузьняцова — да 3 год кожнага і Калошына — да 2 год.**

Гэту пастанову суда працоўныя Барысаўшчыны сустрэлі з вялікім здавальненьнем.

Я. Іваішын.

# *У фашысцкай Польшчы*

## Крывавая барацьба сялян супроць фашысцкай камасацыі

ВІЛЬНЯ, 7. Яшчэ ў чэрвені гораднянская прэса паведамляла **аб крывавых і масавых выступленьнях сялян раду вёсак Гораднянічыны супроць камасацыі.**

Як высьвятляецца, дагэтуль у некаторых вёсках устаноўлена ўладаю фактычна ваеннае становішча. Так, напрыклад, у вёсцы **Баранава** можна выходзіць на вуліцу да 9 гадзін увечары. Дагэтуль сяляне гэтай вёскі не дадаюць уладам праводзіць камасацыю, сыстэматычна зьнішчаючы на палёх устаноўленыя вымяральныя слупы і кольцы.

За апошні час **сыстэматычным зьвяшчам сталі арышты сялян па 5-6 чалавек. Арыштаваных бяруць на пастарунак, моцна зьбіваюць і потым выпускаюць. Такія збойствы робяцца амаль цэлых вёсак.** Сярод сялян расьце абурэньне. Усё больш папулярным становіцца лёзунг: **«Не даваць арыштоўваць сялян, ісьці на пастарунак ад біваць арыштаваных».**

## Сяляне Беласточчыны не жадаюць плаціць падаткаў акупантам

БЕЛАСТОК. У красавіку г. г. у вёсцы Вешхуц, Бельскага павету, адбыліся баявыя выступленьні сялян гэтай і суседніх вёсак супроць сэквэстратараў і паліцыі. Выступленьні гэтыя адбываліся адразу на працягу некалькіх дзён і адрозьніваліся асаблівай вострасьцю.

Гэтымі днямі Беластоцкі акруговы суд разглядаў справу 9 сялян вёскі Вешхуце, якія, як падае фашысцкая прэса, «23 красавіка арганізавалі ў вёсцы вялікі сход і аказалі супраціўленьне павятовану сэквэстратару, які забіраў сялянскія рэчы, вырываючы ў яго гэтыя рэчы». Суд прыгаварыў двух сялян на год турмы, 4-х па шэсьць месяцаў турмы.

Падобныя суды і прыгавары, зьвязаныя з сялянскімі хваляваньнямі, становяцца ўсё больш частым зьявішчам па Заходняй Беларусі.

Ваенная падрыхтоўка ў амэрыканскай армії.

## 12 дзён барацьбы рабочых-нафтавікоў

БАРШТАВА, 13. Забастоўка рабочых нафтавікоў працягваецца ўжо 12 дзён. Учора група ў 60 штрэйкбрэхэраў прабавала пусьціць у рух нафтаачышчальны завод «Нафта» ў Драгабычы. Аднак, бастуючыя прымусілі іх спыніць работу. На заводзе «Галіцыя», дзе працуе трупа інжынэраў штрэйкбрэхэраў, здарыўся выбух паравога катла і сапсаваліся турбіны дызэлю. У рэзультаце работы спынены. На заводзе «Фолім» адміністрацыя затрымала сілаю і не выпускала з заводжай тэрыторыі 85 рабочых. Ня гледзячы на выключныя меры, большасьць затрыманых рабочых адмаўляецца працаваць.

Улада імкнецца мабілізаваць вялікую колькасьць штрэйкбрэхэраў, бо беспрацоўныя адмаўляюцца выконваць ролю штрэйкбрэхэраў. Біржы працы бязьдзейнічаюць, ня гледзячы на пагрозу пазбаўленьня беспрацоўных дапамогі. Дробныя нафтапрамысловцы зьвярнуліся да прафбюракратаў з прапановай падпісаць кампрамісную згоду пры ўмове безадкладнага спыненьня забастоўкі. **Пэнэзаўскі забастовачны камітэт згадзіўся ўжо быў на зрыў забастоўкі,** аднак. на агульным сходзе бастуючых пры ўдзеле 3.000 рабочых рэзалюцыя попэсаўцаў была адкінута і аднагалосна ўхвалена пастанова працягваць усеагульную забастоўку. Адначасова **ўзмацняецца паліцэйскі тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых**

## Беластоцкія шаўцы працягваюць забастоўку

БЕЛАСТОК, 7. Забастоўка беластоцкіх шаўцоў, якая пачалася 19 жніўня, працягваецца. Каля 1.000 шаўцоў Беластоку бастуюць ўжо трэці тыдзень. Забастоўка працякае салідарна. Сац.-фашысцкім правадыром не ўдалося зламаць забастоўку.

## *ХРОНІКА*

* На Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце ў беладрэўным цэху запраставана правядзеньне рацыяналізатарскага мерапрыемства па падвозцы дэталяй у сушыльныя камэры—замест вагонэтак, спэцыяльны трэкі, што дасьць эканомію 18.450 руб. у год.

* **Белдзіяргор закончыў праект пабудовы плянава-эканамічнага камбінату ў Менску.**

* Распачата **пабудова інтэрнату для студэнтаў** магілеўскай сапартшколы на 500 чалавек.

* У Гомелі, у раёне Гомсельмашу будуецца **вялікая гарадзкая рабочая больніца.** Зараз вядуцца работы па пабудове радзільнага і хірургічнага карпусоў.

* Па трэсту Белдрэву за першае паўгодзьдзе затрымана ад прыведзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў **271.600 руб.** і ажыцьцёўлена **200 рабочых прапаноў,** даўшых эканомію **363.113 рублёў.**

* Канчаецца праект **пабудовы вялікага дому** для сельска-гаспадарчых трэстаў Наркамзему. Дом будзе будавацца ў Менску на Сьвярдлоўскай вуліцы.

* Нурэйскім вандроўным тэатрам і яўтрамам прынята да пастаноўкі п'еса яўрэйскага пісьменьніка **Зэльдэна «Кантант».**

* Савет Народных Камісараў БССР асигнаваў аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі **10.000 руб.** на арганізацыю касы ўзаемадапамогі.

* Канчаюцца апошнія адымкі юбілейнага **гукавога поўнамэтражнага фільму «Слава сьвету»** па сцэнарыю тав. **Бродзянскага;** рэжысэр **Вайншток,** аператар **Кальцаты,** музыка камэтэмпэратара **Жыгоцава.** Сцэнары напісан на тэму барацьбы з падрыхтоўкай вайны супроць СССР.

## Паведамленьні

— 18 верасьня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні добраахвотнага пажарнага таварыства склікаецца сход дружыньнікаў. Яўка абавязкова.

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 20 верасьня ў Чачэрску будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б на разгляду наступных апеляцыйных парторгаў Чачэрскага раёну: Манькова Е. С., Фіткевіча А. С., Баранова П. Н., Кузьменкова С. Я. Яўка памянёных т.т. абавязкова з прадстаўленьнем на ПТ характарыстыкі яч. КП(б)Б аб апошняй рабоце.

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ПК, або паведаміць свой адрас (ці месца працы) т. Карпача Аляксандра Міхайлавіча (Клічаўскай арганізацыі) і Волкава Сяргея Адамавіча (Петрык. р-ну). Просьба да усіх арганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня памянёных т.т., паведаміць у ПК.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ПК, ці паведаміць свой адрас, месца працы т.т. Голубева Мікася Арцёмавіча, Тумілоўіча Юлія Кастусёва (Менскай арганізацыі) і Пыранкова Пракопа Дэмітрыевіча (Асіпавіцкай арганізацыі). Просьба да усіх арганізацый, якія ведаюць месца знаходжаньня ўказаных т.т., паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН

„Чырвоная Зорка". Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса — ад 4 г. КУЛЬГАВЫ ПАН. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

„Інтэрнацыянал". Пач.: 6, 7-30, і 10-30. Дзенны сэанс ў 2 г. дня. НА ГЭТЫМ СЬВЕЦЕ кіно-п'еса ў 6 частках. Кіно-хроніка Саюзкіно.

„Пралетары". 2-я серыя Чырвоныя д'ябалята. Дзенныя дзіцячыя сэансы. БАМБІСТ. Па чатах ад 2 г. дня.

Барысаўскі падтэхнікум абавяшчае, што АСЕНЬНІ ПРЫЁМ студэнтаў на 1-шы курс падтэхнікуму і падмурсоў працягнут да 25 верасьня. Дырэкцыя.

Кіно „СПАРТАК" Ад 15 верасьня ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ САКРЭТ ХАРАСТВА камедыя ў 6 частках. У галоўнай ролі Рычард Толмэдж. ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ: Пачатак 1 сэансу—7 гадз. 2 г.—8 г. 15, 3-га—9 г. 30 м., 4-та—10 гадз. 45 м. КАСА—з 5 гадзін.

ІНСТЫТУТУ ЭКАНОМІКІ БАН ПАТРЭБНЫ СТАТЫСТЫКІ. Пэнсыя па згодзе. Дырэкцыя інстытуту.

Тэлефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—4-27; сакратарыят—10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва—13-80; эканамічна-прамысловы—13-80; каапэрацыі і снабжэньня—13-80; вайскова-палітычны—13-80; транспартны—6-19; сацыялістычнага земляробства—6-19; замежнай інфармацыі—6-19; сэктар ударных брыгад—6-19; лістоў рабочых і калгасьнікаў—6-19; культурнага будаўніцтва—6-19, агляду друку—6-19; бібліяграфія—6-19; бюро расьсьледаваньня—6-19.

Тэлефоны канторы: Загадчык канторы—7-81; аддзел аб'яў і бухгальтэрыя—7-81.

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63.

Менск, друкарня «ЗьвяздА». Галоўлітбел № 337.